

ЧАМУ ПАНДЭМІЯ НАКРЫЛА ЭСТОНІЮ? **9**

ЯК МАСТАК ЯЎГЕН КУЛІК РАТАВАЎ ВЕРХНІ ГОРАД **13**





Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

2 САКАВІКА 2021 г. АЎТОРАК № 39 (29408)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір ГУСАКОЎ, старшыня Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук:**

*«Для вырашэння задач, пастаўленых Усебеларускім народным сходам і праграмнымі дакументамі, ужо ў найбліжэйшай перспектыве беларускім навукоўцам трэба сфарміраваць актуальную навуковую базу для найноўшых дасягненняў, заснаваных на штучным інтэлекце, суперкамп'ютарах, авіякасмічных даследаваннях, смарт-энергетыцы, электратранспарце, прэцызійнай фармацэўтыцы, кампазітных матэрыялах, тонкай хіміі, дакладным земляробстве і жывёлагадоўлі, функцыянальным харчаванні, а галоўнае — на гісторыка-культурнай спадчыне і гуманістычных каштоўнасцях».*



# Гарманіст прышвартаваўся пад Валожынам...

Самадзейны гарманіст з вёскі Гарадзькі Валожынскага раёна Мікалай СКАПЕЦ — былы марак-падводнік (ён заўсёды носіць цяльняшку, а на агароджы яго падворка намаляваны якар), аграном і брыгадзір у мірным жыцці, а таксама выдатны майстар па сталярцы і цяслярстве. У маленстве, амаль у пяць гадоў, «захварэў на музыку». Родны дзед — аматар танцаў і спеваў, убачыўшы, як унук літаральна млее і цягнецца да інструмента, набыў малому гармонік і стаў яго першым настаўнікам па музыцы.

— Праўда, вучыў ён не на клавішах, а па вуснах, дакладна імітуючы мелодыю. А ў дзеда ўсе мелодыі былі народныя, — кажа Мікалай Іванавіч пра свайго настаўніка. — Дзед хацеў, каб я быў добры музыка. Сапраўды, праз год я ўжо ўмеў іграць і полечкі, і кракавяк, і вальс.

Музычная адукацыя зрабіла Скапца вядомай асобай і ў Гарадзьках, і ў вёсках па суседстве: яго запрашалі на «выправы» — провады ў армію, на хрэсьбіны. Ён і цяпер, нягледзячы на пенсійны ўзрост, — «першы хлопец на вёсцы» (так раней казалі пра вясковых гарманістаў). І не таму, што застаўся амаль адзін такі, вясковы музыка, а што спрытна, як і раней, перабірае клавішы, трымае рытм і мелодыю. Мікалай Іванавіч сваімі рукамі і душою захоўвае музычную народную спадчыну, якая, як вядома, з'яўляецца нематэрыяльнай каштоўнасцю. Спадзяюся, наведвальнікі нашага сайта, паглядзеўшы невялікае відэа, адкрыюць у ім яшчэ аднаго самабытнага музыканта і парадуюцца за валожынскую зямлю, якая нараджае такія таленты.

*Глядзіце відэа на zviazda.by.*

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

Індывідуальнае будаўніцтва

# НЕ МЕНШ ЯК 28 «КВАДРАТАЎ» НА ЧАЛАВЕКА

## Менавіта такога ўзроўню забяспечанасці насельніцтва жыллём плануецца дасягнуць ужо да 2025 года

**Апошнія некалькі гадоў аб'ём жылля, якое ўводзіцца, у нашай краіне істотна не мяняецца — каля чатырох мільёнаў квадратных метраў за год. Але да 2025 года забудоўшчыкі разлічваюць выйсці на 4,5 мільёна «квадратаў». Узрасце хуткасць узвядзення жылля, у тым ліку і за кошт праграмы комплекснай забудовы індывідуальнага жылля. Жыллёвае будаўніцтва будзе працягваць грунтавацца на спалучэнні шматпавярховага і індывідуальнага малапавярховага. Акцэнт будзе зроблены на падтрымку індывідуальнага жылля сядзібнага тыпу з аб'ектамі інжынернай, транспартнай і сацыяльнай інфраструктуры.**



СТАР. 4

# АД ЗАДУМЫ — ДА РЭАЛІЗАЦЫІ

## Яркім праектам моладзі — дарогу!

**Днямі прайшоў фінал 10-га сезона рэспубліканскага маладзёжнага праекта БРСМ «100 ідэй для Беларусі». Усяго было пададзена больш за 1200 заявак ад таленавітых хлопцаў і дзяўчат з усіх куткоў краіны, у фінал прайшла сотня найлепшых праектаў па розных кірунках.**

СТАР. 8



Фота Газны ЗАНКАВІЧ.

Ініцыятыва «Птушыны дом» прынёс Тацццяне СІНЯЎСКАЙ *(пасярэдзіне)* перамогу.

## КОРАТКА

- Віктар Лукашэнка вызвалены ад пасады памочніка Прэзідэнта Беларусі па нацыянальнай бяспецы ў сувязі з пераходам на выбарную пасаду.
- **Конкурс на прэмію ўрада за дасягненні ў галіне якасці аб'яўлены ў Беларусі.**
- Міністэрства аховы здароўя ўвяло зніжкі да 25 % на працэдуры дзяржрэгістрацыі.
- **Беларусбанк устанавіў ліміты на асобныя аперацыі па картках.**
- Восем медалёў выйгралі барцы з Беларусі на турніры ў Кіеве.

ISSN 1990 — 763X


ЗВЯЗДА *Да чытача з любоўю!*

**Падпішыся на «Звязду» – і выйграй карысны прыз!**

**Ідзе падпіска на II квартал 2021 года**

**ВЯСНА І ЛЕТА — З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ!**

З першых вуснаў

# «Неабходна выпрацаваць у глабальным плане палітыку цэнаўтварэння»

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка прыняў з дакладам старшыню Камітэта дзяржаўнага кантролю Васіля Герасімава. Асноўныя пытанні, на якіх засяродзіў сваю ўвагу кіраўнік краіны падчас размовы, — заробкі «ў канвертах», кантроль за цэнамі (у першую чаргу на лекавыя сродкі), неабгрунтаванае пасрэдніцтва паміж арганізацыямі.**

## ЗАРОБКІ «Ў КАНВЕРТАХ»

Пасада старшыні КДК для Васіля Герасімава новая — ён прызначаны на яе крыху больш за месяц таму, а з верасня выконваў абавязкі кіраўніка. Таму Прэзідэнт падкрэсліў, што да пытання эфектыўнасці работы камітэта вернуцца пазней — пасля паўгода работы новага кіраўніка.

Па яго словах, галоўныя для КДК кірункі — ацэнка бюджэту і дзяржаўнай маёмасці. І тут пытанне да Васіля Герасімава ад Прэзідэнта: як бачыць ён работу ў гэтых сферах?

Акрамя таго, кіраўніка дзяржавы цікавілі іншыя пытанні, якімі займаецца КДК: кантроль за выплатай заработнай платы, дзейнасць падатковых органаў і фінансавай міліцыі.

Як ён адзначыў, не абміне КДК праблема заробкаў «у канвертах». «Трэба раз і назаўсёды спыніць гэтую гадзіну, каб ніколі гэтая гідра галаву ў нас не падняла. Я не скажу, што гэта ў нас квітнее, але гэта ёсць. І нават на мяне выходзяць асобныя камерсанты, бізнесмены і скардзяцца: «Мы вось плацім па ведамасці, як дадзена, і ад гэтага ж налічэнне ідзе ў сацыяльныя фонды, а вось там не плацяць». Нават называюць канкрэтныя фірмы», — падзяліўся Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка мяркуе, што неабходна ўвесці адказнасць і для тых, хто атрымлівае заробкі «ў канвертах». «Тады яны перастануць браць. А перастануць браць — і жадання плаціць такім чынам будзе менш, — дадаў кіраўнік краіны. — ***Трэба ўсіх паставіць у роўныя ўмовы. Гэта нармальна, у любой краіне гэта нецярпімыя рэчы, самае жорсткае пакаранне ў эканамічным плане — нявыплата падаткаў.*** Таму без вас у Беларусі тут мы парадак не навядзём».

Працаваць з праблемай пачала фінансавая міліцыя — і, як заявіў Прэзідэнт, хацелася б працягнуць гэту дзейнасць. Ён мяркуе, што людзі, асабліва бізнесмены, зразумеюць: выплаты «ў канвертах» неабходна спыніць.

«У адваротным выпадку — страціш маёмасць. Тут штрафамі не абыдзешся, ***неабходна ўводзіць сур'ёзную адказнасць. Папаўся першы раз — заплаціў добры штраф, а потым і маёмасць страціш. Нам такія бізнесмены не патрэбны, якія не плацяць падаткі»,*** — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт падкрэсліў, што КДК шмат працуе з рэальным сектарам эканомікі і ад гэтага таксама не трэба адыходзіць.

## ПАСРЭДНІЦТВА, ЯКОЕ НЕ ТРЭБА

Яшчэ адзін кірунак, дзе неабходна працаваць, як дадаў кіраўнік краіны, і які разглядалі на Усебеларускім народным сходзе, — пасрэдніцтва.

«Пасрэднікі садзейнічаюць заўсёды павышэнню кошту тавараў да 30 працэнтаў, а тое і больш па асобных пазіцыях. Нам такое пасрэдніцтва не трэба. Трэба выключыць усякае пасрэдніцтва ўнутры Беларусі», — сказаў Прэзідэнт. Ён заявіў, што неабходна ўнесці ў гэтым плане адпаведную прапанову.

Аляксандр Лукашэнка працягнуў, што без КДК ніяк і ў пытанні цэнаўтварэння. Але адзначае: ведамства тут не павінна бегчы наперадзе прафсаюзаў, дэпутатаў і Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю.

«Але нейкую канцэптуальную ролю вы павінны іграць. То-бок вы павінны аналізаваць, бачыць, што неабходна прымаць у плане цэнаўтварэння. Прынята было рашэнне ўрадам па папярэджанні неабгрунтаванага росту цэн. Хтосьці віскнуў наконт 10 працэнтаў ПДВ. Што такое 10 працэнтаў ПДВ, але пад гэта ўсе пачалі падымаць цэны. Значыць, жорсткім чынам неабходна спыняць», — загадаў кіраўнік краіны.

## НЕ ЖЫВІЦЦА НА ЗДАРОЎІ ЛЮДЗЕЙ

Асабліва Прэзідэнт адзначыў, што галоўнае — кантроль за цэнамі на лекавыя сродкі.

«Мы не павінны дазволіць рознага кшталту «ачумелым» жывіцца на бедах людзей. Ніхто з іх не прынёс капейку на падтрымку лячэння ад ковіду. Ніхто. Толькі дзяржава ўжо мільярд долараў затраціла на гэта з усіх крыніц. Што, хтосьці прыйшоў з уласнікаў аптэк і іншых і даў грошы? Ніхто не даў», — абурыўся Аляксандр Лукашэнка.

Па яго звестках, у краіне працуюць 50 на 50 дзяржаўныя і прыватныя аптэкі. «Калі да прытомнасці не прывядзём прыватнікаў, ну што ж. Тады будуць працаваць дзяржаўныя аптэкі. Але мы не можам дазволіць на здароўі людзей жывіцца. Таму лекі — на асобны кантроль», — даў даручэнне Прэзідэнт.

Як адзначае кіраўнік краіны, трэба ведамству сачыць і за цэнамі на сацыяльна значныя тавары іншых катэгорый. «Неабходна выпрацаваць у глабальным плане палітыку цэнаўтварэння, каб не выглядаць рэтраградамі і не стварыць дэфіцыт, каб і людзі бачылі, што няма неабгрунтаванага росту цэн», — растлумачыў Аляксандр Лукашэнка.

## НЕДАХОПЫ І РЭЗЕРВЫ БРЭСТЧЫНЫ

Васіль Герасімаў з'яўляецца ўпаўнаважаным па Брэсцкай вобласці, таму кіраўнік краіны папрасіў звярнуць увагу на праблемы рэгіёна.

«Хацелася б, каб вы сказалі пару слоў, як бачыце там сваю работу і як вы ацэньваеце работу новага губернатара вобласці. Я планую сур'ёзна заняцца Брэсцкай вобласцю. Пасля Гродзенскай вобласці пабуду ў Брэсцкай. Вы павінны ўсё вывучыць там і мне далажыць потым на месцы асноўныя недахопы і рэзервы, якія мы можам выкарыстаць на Брэстчыне», — анансаваў шэраг тэм для размовы кіраўнік краіны.

**Марыя ДАДАЛКА.**

**❍ Каментарый у тэму**

У размове з журналістамі **старшыня КДК Васіль ГЕРАСІМАЎ** запэўніў, што разам з іншымі ведамствамі і міністэрствамі КДК займаецца пытаннямі цэн на спажывецкія тавары і лекавыя сродкі.

«У большасці сваёй цэны пайшлі ўніз яшчэ да таго, як Савет Міністраў прыняў пастанову, якая абмяжоўвае штомесячнае павышэнне. І яно таксама адыграе сваю ролю надалей. Мы на гэтым не спыняемся. Некалькі разоў на тыдзень групы маніторацъ аптэчную сетку, каб валодаць інфармацыяй з месцаў. Па выніках гэтых маніторынгаў будуць прыняты дадатковыя меры па зніжэнні цэн», — сказаў старшыня КДК.

У першую чаргу яны закрануць тых, хто не прыняў дзеянняў па зніжэнні адразу, і тых, хто знізіў цэны недастаткова ў параўнанні з павышэннем.

«Многія гэта звязалі з адменай ільготы па ПДВ. Каб вы разумелі, ільгота была па ПДВ 10 працэнтаў, а цэны некаторыя павысілі на 30 працэнтаў», — паясніў Васіль Герасімаў.

Пытаннем пасрэдніцтва і заробкаў «у канвертах» КДК займаецца на планавай аснове з унясеннем шэрагу заканадаўчых ініцыятыў.

«Тэма гэта надзённая (заробкі «ў канвертах» — **«Зв.»**). Па-першае, гэта няроўная канкурэнцыя паміж суб'ектамі гаспадарання. Адзін плаціць усе падаткі, іншы — не плаціць і, зразумела, па-іншаму паводзіць сябе на рынку. Па-другое, ад гэта пакутуюць і грамадзяне. Калі чалавек не плаціць у Фонд сацабароны, адпаведна, ён не атрымае пенсію. Калі захоча ўзяць крэдыт, не пакажа заробак, пры якім магчыма ўзяць крэдыт ці паручыцельства», — канстатаваў кіраўнік ведамства.

Ён падкрэсліў, што ўвядзенне пакарання для тых, хто атрымлівае заробкі «ў канвертах», абгрунтаванае, бо работнік свядома ідзе на парушэнне.

Таксама на кантролі камітэта даўгабуды. Паводле аналізу ведамства, па краіне такіх праблемных аб'ектаў звыш 4400. З іх 47 % будуецца больш за пяць гадоў, 19 % — больш чым 20 гадоў.

«Усе гэтыя аб'екты неабходна абследваць з пункту гледжання стану, мэтазгоднасці далейшай будоўлі ці зносу таго, што ёсць, з выхадам на канкрэтную праграму па кожным аб'екце», — дадаў Васіль Герасімаў.

Блізкая ўлада

# Разабрацца і дапамагчы

**На працягу гэтага года ўсе пандусы каля пад'ездаў жылых дамоў у сталіцы павінны быць прыведзены ў парадак. Такое даручэнне даў падчас прамой тэлефоннай лініі старшыня Мінгарвыканкама Уладзімір КУХАРАЎ, паведаміла БелТА.**



Фота БелТА.

На прамую лінію мэра патэлефанаваў адзін з жыхароў дома па вуліцы Нікіфарава. У яго было адразу некалькі заўваг да кіраўніцтва ЖЭУ. Дырэктар адмаўляе ў правядзенні дэратызацыі, у рамонце смеццеправода. У пад'ездзе і падвале антысанітарыя. Акрамя таго, пандус у месцы стыку з зямлёй разбураны. «ЖЭУ сцвярджае, што пандус устаноўлены не па праекце, таму рамантаваць яго не будуць», — растлумачыў заяўнік.

«За гэты год усе пандусы, якія ёсць, трэба прывесці ў адпаведнасць. Няхай зробяць бягучы рамонт, дзе неабходна», — даручыў Уладзімір Кухараў **генеральнаму дырэктару Мінскай гарадской жыллёвай гаспадаркі Сяргею РУБАНАВУ.**

Нямала званкоў датычылася касметычнага рамонту пад'ездаў. Адна мінчанка выказала сваю нязгоду з тым, што аплата гэтых работ для кожнага жыхара пад'езда размяркоўваецца зыходзячы з плошчы яго кватэры. Уладзімір Кухараў растлумачыў, што такія нормы закладзены ў новую рэдакцыю Жыллёвага кодэкса, які ўступіў у сілу са студзеня 2020 года.

Пенсіянерка, якая пражывае на вуліцы Талстога, паскардзілася на якасць касметычнага рамонту ў іх пад'ездзе. «З дзевяці паверхаў толькі на трох памылі столі, вокны проста замазалі фарбай, не адчынялі нават. На маім сёмым паверсе дзверы пафарбавалі ў баявую расфарбоўку. І за такую халтуру яшчэ грошы вылічваюць», — абуралася жанчына. Яна здзіўляецца, як такі рамонт наогул мог быць прыняты. «Мы разбяромся. Калі нешта не так, прымусім выканаўцаў перарабіць», — запэўніў Уладзімір Кухараў. І адразу ж даручыў Сяргею Рубанаву вывучыць сітуацыю на месцы.

У гістарычным цэнтры горада на Гарадскім вале пачата будаўніцтва пяціпавярховага адміністрацыйнага будынка з падземнымі гаражамі. Жыхары тутэйшай нізкапавярховай забудовы такім суседствам незадаволеныя. «Прасочым, каб будаўнікі не нашкодзілі навакольнай тэрыторыі», — запэўніў мэр. І даручыў уважліва кантраляваць санітарны стан пляцоўкі каля аб'екта будаўніцтва.

Жыхарка дома па вуліцы Хмяльніцкага, на першым паверсе якога з 1 снежня 2020 года адкрыўся рэстаран грамадскага харчавання, такім суседствам таксама не задаволена. Па яе скарзе былі праведзены замеры шуму, і з 10 лютага па загадзе санстанцыі Савецкага раёна дзейнасць установы прыпыненая. Але ўжо 24 лютага рэстаран зноў адкрыўся, без дазволу. «Прымем меры ў адпаведнасці з заканадаўствам», — запэўніў Уладзімір Кухараў.

Жыхары дома па вуліцы Карвата паскардзіліся на недастаткова гарачую ваду ў доме і яе слабы напор (даводзіцца шмат зліваць, пакуль пойдзе вада патрэбнай тэмпературы), няякасную прыборку. Таксама ў пад'ездзе неўзабаве пасля капітальнага рамонту на пяці паверхах энергазберагальныя асвятляльныя лямпы перагарэлі, але заяўку на замену проста ігнаруюць. Па ўсіх трох пытаннях будзе праведзена праверка.

У цяжкай сітуацыі апынуліся жыхары новабудоўлі на праспекце Міра. З пачатку кастрычніка 2020 года, калі дом быў здадзены, яны зафіксавалі больш за паўсотню парушэнняў, дом малапрыдатны для пражывання. Забудоўшчык не рэагуе, найбліжэйшую сустрэчу з жыхарамі прызначыў наогул на красавік. Чашу іх цярпення перапоўніла тое, што чатыры дні ў кватэрах не было ніякай вады. На «гарачай» лініі жыхарам далі адказ: дом не знаходзіцца на балансе горада (інжынерныя сеткі не перададзены эксплуатацыйным арганізацыям, таму забудоўшчык павінен іх абслугоўваць сам і несці адказнасць). «Камісійна з удзелам Дзяржбуднагляда, адміністрацыі раёна разбяромся з выездам на месца», — паабяцаў Уладзімір Кухараў.

Народны сход: вынікі і высновы

# Вёска як увасабленне дзіцячай мары

**Гродзенка Юлія БУДЗЬКО з дзяцінства марыла працаваць з вялікімі жывёламі, таму і паступіла ў Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт. Менавіта ад гэтай навучальнай установы яна ўдзельнічала ў VI Усебеларускім народным сходзе.**


Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

«Сёлета я атрымаю дыплом ветэрынарнага ўрача і паеду працаваць у вёску, таму мне было цікава, як будуць развівацца рэгіёны ў нашай краіне, — расказала яна журналісту «Звязды». — Згодна з асноўнымі палажэннямі праекта праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны, якія былі ўхвалены сходам, рэгіянальная палітыка будзе накіравана на павышэнне прывабнасці для жыцця, работы і бізнесу тэрыторый, якія размешчаны за межамі сталіцы і абласных цэнтраў.

Гэта актуальна для моладзі. Я гараджанка, але збіраюся працаваць з вялікімі жывёламі і жыць, прынамсі, у найбліжэйшыя гады, у вёсцы. Таму важна было пачуць, што мясцовая ўлада зможа атрымаць большую свабоду ў распараджэнні маёмасцю і зямельнымі ўчасткамі, а ў жыллёвай палітыцы акцэнт будзе зроблены на падтрымку індывідуальнага будаўніцтва. Пры пэўных умовах з'явіцца магчымасць бясплатна атрымаць участак пад будаўніцтва ўласнага дома. Да таго ж, сярэдні кошт аднаго квадратнага метра жылля, якое будуецца з дзяржаўнай падтрымкай, будзе падтрымлівацца на ўзроўні не вышэй за сярэдні заробак па краіне.

Зараз праходжу практыку ў СВК «Сынковічы» Зэльвенскага раёна Гродзенскай вобласці, ужо трэці раз за гады вучобы працую ў гэтай гаспадарцы. Мне там усё вельмі падабаецца, у тым ліку і ўмовы, якія прапануюць маладым спецыялістам. Хацелася б туды і размеркавацца.

У Сынковічах маладым спецыялістам прапануюць кватэры ці дамы з выгодамі. Да таго ж, гэта аграгарадок, там ёсць дзве крамы, пошта, аптэка, школа, дзіцячы садок, дом культуры.

Малочнатаварны комплекс, на якім працую, мае найсучаснае абсталяванне. У ім створаныя добрыя ўмовы для жывёл, пастаянна павышаецца прафесіянальны ўзровень спецыялістаў, аддаецца дастатковая ўвага інтарэсам моладзі.

Але я была і ў гаспадарках, дзе ўсё не так добра. На мой погляд, галоўнае, чаго не хапае жывёлагадоўлі нашай краіны — спецыялістаў з добрым узроўнем перадавых ведаў. У той жа ветэрынарыі — ведання найноўшых прэпаратаў».

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

Надвор'е

## Пачатак ранняй вясны прыходзіць паводле «раскладу»:

часам з мокрым снегам, а месцамі і з невялікім марозам

**З першых дзён вясны да нас прыйшло яснае сонца і стала сапраўды цёпла. Мінулы люты, нягледзячы на адліжнае надвор'е ў канцы месяца, аказаўся на 1-3 градусы халаднейшы, чым звычайна. Ападкаў у многіх раёнах Беларусі выпала блізка да месячнай нормы, толькі месцамі па Гомельскай і ўсходзе Магілёўскай вобласці іх было з лішкам — каля дзвюх лютаўскіх нормаў. А вось у першы тыдзень сакавіка чакаецца да 11 цяпла, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра гідраметэаралогіі, кантролю радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

У другі дзень вясны на большай частцы краіны будзе без ападкаў, толькі ўдзень па паўночным усходзе месцамі пройдуць кароткачасовыя мокры снег і дождж. Вецер заходні, удзень парывісты. Максімальна паветра будзе прагравацца да плюс 3—9 градусаў. У сераду Беларусь застанецца ў вобласці павышанага атмасфернага ціску. Аблокаў стане менш. Істотных ападкаў не чакаецца. Уначы і раніцай чакаюцца слабыя туман і галалёд, на дарогах месцамі галалёдзіца. Вецер паўночна-заходні, заходні ўмераны, па паўночным усходзе краіны парывісты. Тэмпература паветра ўначы будзе ад мінус 4 градусаў да 1 цяпла, удзень будзе ад 3 да 10 градусаў вышэй за нуль.

У чацвер уначы надвор'е ў асноўным будзе вызначаць вобласць павышанага атмасфернага ціску, у ранішнія і дзённыя гадзіны адаб'еецца ўплыў атмасфернага фронту, які ссоўваецца з боку Балтыйскага мора. Павялічыцца і стане больш шчыльнай воблачнасць. Уначы будзе пераважна без ападкаў, раніцай і ўдзень на большай частцы краіны пройдзе кароткачасовы снег, месцамі мокры снег. Ноччу і раніцай чакаюцца слабыя туман і галалёд, на асобных участках дарог галалёдзіца. Вецер будзе заходні, паўночна-заходні парывісты. Тэмпература паветра ў начныя гадзіны чакаецца ад мінус 3 да плюс 3 градусаў, удзень паветра прагрэецца да 2—8 цяпла, па поўдні — да плюс 11 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, бліжэй да канца тыдня сітуацыя ў атмасферы зменіцца. У пятніцу праз нашу краіну чакаецца перамяшчэнне халоднага франтальнага раздзела. Уначы на большай частцы тэрыторыі, удзень месцамі пройдзе кароткачасовы снег, мокры снег, па поўдні з дажджом. Вецер паўднёва-заходні слабы, удзень парывісты. У асобных раёнах будзе слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе 1—7 марозу, па поўдні — ад нуля да 1 цяпла. У дзённыя гадзіны тэмпература паветра будзе вагацца ад мінус 3 да плюс 3 градусаў. У найбліжэйшыя выхадныя чакаецца зімовы характар надвор'я. У асобных раёнах краіны пройдзе невялікі кароткачасовы снег.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## Павіншуй родных — дапамажы дзецям!

**1 сакавіка стартавала дабрачынная акцыя «Дабро пачынаецца з нас»**

**Дзіцячы фонд ААН (ЮНІСЕФ) у Беларусі прапануе аформіць электронную або папяровую паштоўку, здзейсніўшы такім чынам ахвяраванне. Зрабіць гэта можна на сайце арганізацыі https://unicef.by/postcards/, а валанцёры ЮНІСЕФ у Беларусі адправяць яе адрасату.**

У той час як многія вымушана або добраахвотна застаюцца дома на самаізаляцыі, словы падтрымкі будуць для іх надзвычай актуальныя. Новыя дабрачынныя паштоўкі Дзіцячага фонду ААН (ЮНІСЕФ) у Беларусі створаны на аснове малюнкаў дзяцей з інваліднасцю і напоўнены самымі шчырымі і добрымі пажаданнямі юных мастакоў. Цяпер можна выбраць паштоўку да Дня нараджэння ці павіншаваць блізкіх з надыходам вясны, але на працягу года калекцыя паштовак будзе папаўняцца.

Скарыстацца паштоўкамі і павіншаваць кліентаў могуць і кампаніі: такі знак увагі падкрэсліць сацыяльна адказную пазіцыю і жаданне змяняць жыццё дзяцей да лепшага.

Усе атрыманыя сродкі пойдуць на падтрымку праграмы «Сям'я кожнаму дзіцяці», якая дапамагае дзецям з інваліднасцю аднавіць кантакт з бацькамі або знайсці новую сям'ю, а маладым людзям з інваліднасцю — наладзіць самастойнае жыццё пры падтрымцы спецыялістаў і валанцёраў.

З 2018 года праграма «Сям'я кожнаму дзіцяці» рэалізуецца ў Гомельскай вобласці. У 2018—2019 гадах акцэнт быў зроблены на ўдасканаленне работы з сем'ямі, якія выхоўваюць дзяцей з інваліднасцю. У выніку каля 500 бацькоў атрымала інфармацыю аб сваіх правах, даступных медыцынскіх, рэабілітацыйных, сацыяльных і адукацыйных паслугах. Палепшылася становішча 51 дзіцяці ў 45 родных сем'ях. У чатырох выпадках спецыялісты прадухілілі адмову ад дзяцей.

Традыцыя дарыць паштоўкі за невялікае ахвяраванне на развіццё праграмнай дзейнасці ЮНІСЕФ у Беларусі нарадзілася ў 2020 годзе напярэдадні Каляд. Тады навагодняя паштоўкі атрымала каля 200 чалавек па ўсёй краіне. Гэтым разам акцыя «Дабро пачынаецца з нас» стартуе напярэдадні свята жанчын — 8 Сакавіка.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Кампус

## МАЙСТЭРСТВА АНАЛІТЫКІ

Студэнцкі аналітычны клуб адкрыецца ў БДУ

**Ініцыятыва накіравана на фарміраванне прафесійнай супольнасці аналітыкаў з ліку студэнтаў і магістрантаў, а таксама стварэнне ўмоў для самарэалізацыі моладзі ў галіне інфармацыйна-аналітычнай работы.**

У клубе будуць развівацца два кірункі. Адзін з іх, адукацыйны, арыентаваны на падрыхтоўку студэнтаў у галіне даследаванняў і вывучэння актуальных сацыяльна значных праблем. Для членаў клуба падрыхтаваны шасціТыднёвы курс лекцый і семінараў па складанні аналітычных запісак, справаздач і інфармацыйных маніторынгаў. Таксама студэнты будуць вывучаць метады збору, аналізу і апрацоўкі даных. Завершыцца навучанне распрацоўкай індывідуальнага аналітычнага праекта. Напрыклад, гэта могуць быць прапановы па карэкціроўцы работы структур, маладзёжных арганізацый БДУ на аснове аналізу адкрытых даных, грамадскай думкі і замежнага вопыту.

Практычны кірунак прадугледжвае прыцягненне членаў клуба да сумеснай выпрацоўкі сістэмных і навукова абгрунтаваных рашэнняў задач, якія датычацца адміністрацыйнай, адукацыйнай, навуковай і іншай дзейнасці.

Таксама клуб будзе выступаць дыскусійнай пляцоўкай з прыцягненнем знешніх экспертаў для абмеркавання актуальных пытанняў сацыяльна-эканамічнага, палітычнага і грамадскага жыцця.

Набор у аналітычны клуб плануюць праводзіць раз у год. Ініцыятарам яго стварэння выступіла ўпраўленне экспертнай і аналітычнай работы БДУ.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### У Еўропе працягваюцца пратэсты з-за каранцінных мер



Абмежавальныя меры, якія дзейнічаюць у Еўропе для барацьбы з распаўсюджваннем каранавіруса, у мінулыя выхадныя выліліся ў пратэсты і беспарадкі ў некаторых еўрапейскіх гарадах, паведаміла Euronews. Так, у Будапешце тысячы чалавек узялі ўдзел у акцыі «Вярніце нашы жыцці». «Нам надакучылі гульні палітыкаў, мы хочам самі распараджацца нашым жыццём. Мы не дадзім сябе трымаць пад замком. Не навязвайце нам тое, што не мае сэнсу», — заявіў арганізатар дэманстрацыі ўрач Дзьёрдзь Гудзені. Адзначаецца, што паліцыя разагнала пратэстоўцаў. У Дубліне маніфестацыя супраць лакдаўна перарасла ў сутыкненні з паліцыяй. Арыштаваны 23 чалавекі, трое вартавых парадку атрымалі раненні. У Капенгагене адбылася чарговая акцыя пратэсту, арганізаваная рухам «Людзі ў чорным». У ёй узяло ўдзел некалькі сотняў чалавек.

### Дамінікана ўзвядзе агароджу ўздоўж граніцы з Гаіці

Прэзідэнт Дамініканскай Рэспублікі Луіс Абінадэр абвясціў пра планы будаўніцтва агароджы на мяжы з Гаіці працягласцю каля 380 кіламетраў. Аб гэтым паведаміла Бі-бі-сі. Луіс Абінадэр заўважыў, што бар'ер дапаможа абмежаваць нелегальную іміграцыю, наркотыкі і паток сагнаных аўтамабіляў паміж дзвюма краінамі. Узвядзенне аб'екта пачнецца ў канцы гэтага года. Адносіны паміж дзвюма суседнімі краінамі былі гістарычна складаныя. «На працягу двух гадоў мы хочам палажыць канец сур'ёзным праблемам нелегальнай іміграцыі, незаконнага абароту наркотыкаў і перамяшчэння ўкрадзеных аўтамабіляў», — сказаў Луіс Абінадэр у звароце да Кангрэса.

### Facebook заплаціць $650 млн за парушэнне прыватнасці карыстальнікаў

Акруговы суддзя Джэймс Даната ўхваліў сусветнае пагадненне, у рамках якога кампанія Facebook выплаціць істцам 650 мільёнаў долараў, паведаміў golosameriki.com. Пагадненне ўрэгулюе калектыўны іск, пададзены ў Ілінойсе ў 2016 годзе ад імя амаль 1,6 мільёна карыстальнікаў супраць сацсеткі Facebook, які абвінавацій кампанію ў парушэнні недатыкальнасці прыватнай інфармацыі. «Кожны з істцоў, зацікаўлены ў атрыманні кампенсацыі, атрымае на рукі як мінімум 345 долараў», — напісаў у сваім рашэнні суддзя, назваўшы пагадненне «сур'ёзнай перамогай спажыўцоў у ... сферы прыватнасці лічбавай інфармацыі». Істцы абвінавацілі найбуйнейшую ў свеце сацыяльную сетку ў парушэнні закона штата Ілінойс аб канфідэнцыяльнасці біяметрычнай інфармацыі (BIPA). Кампанія выкарыстоўвала тэхналогію распазнавання асоб на фотаздымках, загружаных карыстальнікамі на сайт, не атрымаўшы ад іх згоды на гэта.

Ну і ну!

## З кватэры ўкралі толькі тахту і падушкі

**Даволі незвычайны крадзеж адбыўся ў Слоніме. Там у адзін з дзён у 19-гадовага маладога чалавека проста з пакоя знікла... тахта коштам 300 рублёў. Акрамя таго, зламысніх быў настолькі беспардонным, што выбіў уваходныя дзверы і нават забраў усе падушкі. Падрабязнасці гісторыі паведаміла аддзяленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Гродзенскага аблвыканкама.**

Інцыдэнт адбыўся позным вечарам у шматпавярховым доме па вуліцы Ефрасінні Полацкай, калі ў кватэры нікога не было. Аказалася, што здзейсніў крадзеж 18-гадовы малады чалавек, які пражывае ў суседнім пад'ездзе. Дома ў пацярпелага ён быў усяго раз, але пра наяўнасць там тахты ўспомніў. Ідэя завалодаць мэбляй прыйшла, калі падазраваны адпачываў з сябрамі. Менавіта тады хлопец зразумеў, што яму неабходна дадатковае спальнае месца. Таксама ён ведаў, што ўладальнік тахты вучыцца ў Гродне, і кватэра пустая.

Вынесці цяжкую мэблю зламысніку дапамаглі сябры, якім ён сказаў, што гэта робіцца з дазволу гаспадара. Карціну таго, што адбылося, аднавілі супрацоўнікі крымінальнага вышуку Слонімскага РАУС, падазраваны затрыманы, у дачыненні да яго заведзена крымінальная справа па артыкуле «Крадзеж», украдзенае канфіскавана.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# НЕ МЕНШ ЯК 28 «КВАДРАТАЎ» НА ЧАЛАВЕКА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Плануецца бязвыплатна выдзяляць грамадзянам невыкарыстоўваемыя зямельныя ўчасткі для будаўніцтва жылля ў так званых неперспектыўных вёсках з умовай навядзення парадку як на самім участку, так і на прылеглай да яго тэрыторыі.

## Не менш за 40 % персанальных дамоў?

Узвядзенню індывідуальных дамоў адведзена адна з ключавых роляў у праекце дзяржпраграмы «Будаўніцтва жылля» на 2021—2025 гады. Чакаецца, што дзякуючы прымяненню новых эксплуатацыйных і праектных рашэнняў, а таксама экалагічных матэрыялаў, яно стане больш даступнае.

Дырэктывай кіраўніка дзяржавы № 8 даручана забяспечыць будаўніцтва індывідуальнага жылля ў памеры не менш за 40 % ад агульнага аб'ёму збудаванага жылля, хоць на практыцы атрымліваецца нават больш, паведаміў на прэс-канферэнцыі **начальнік Галоўнага ўпраўлення будаўніцтва і жыллёвай палітыкі Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Уладзіслаў ШАПАВАЛАЎ.**

Летась, па звестках Белстата, уведзена ў эксплуатацыю 10 023 індывідуальныя жылыя дамы, агульная плошча якіх —1 748,9 тысячы квадратных метраў (110,2 % ад гадавога задання), што складае 42 % ад агульнай плошчы жылых дамоў, уведзеных у эксплуатацыю. На думку спікера, гэта сведчыць аб запатрабаванасці такога віду будаўніцтва.

**Лідарамі па будаўніцтве жылля за апошнія гады з'яўляюцца: Мінская вобласць (29 % ад уводу ў эксплуатацыю жылля ў цэлым па краіне), горад Мінск (17 %) і Брэсцкая вобласць (16 %) па выніках 2020 года.**

Найбольшай папулярнасцю карыстаюцца ўчасткі, размешчаныя вакол буйных і сярэдніх населеных пунктаў. Істотны ўплыў на запатрабаванасць зямельных надзелаў аказвае і наяўнасць інфраструктуры.

Для фарміравання зямельных участкаў для індывідуальнага жыллёвага будаўніцтва, а таксама забеспячэння ўмоў праектавання і будаўніцтва індывідуальных (блакіраваных) жылых дамоў падрыхтаваны спецыяльныя спісы. У тым ліку з канструкцый індустрыяльнага домабудавання, маніторынгу ўдзельнай вагі індывідуальнага жылля ў агульным уводзе ў эксплуатацыю жылых памяшканняў. У рамках выканання плана мерапрыемстваў па рэалізацыі Дырэктывы № 8 аблвыканкамамі зацверджаны рэгіянальныя комплексы мерапрыемстваў па індывідуальным жыллёвым будаўніцтве.

## Хутка і нядорага

Уладзіслаў Шапавалаў адзначыў, што сёння рэалізацыя індывідуальнага жыллёвага будаўніцтва ажыццяўляецца двума спосабамі: самастойна грамадзянамі і дзяржаўнымі заказчыкамі. «Як паказвае практыка, грамадзяне заказваюць у падрадных арганізацый толькі асобныя віды работ. Хоць, на нашу думку, гэта не зусім правільна, таму што пры будаўніцтве такім спосабам грамадзяне не ўлічваюць усіх выдаткаў, якія потым па выніку пануюць», — падкрэсліў ён.



Таксама прадстаўнік ведамства паведаміў, што будаўніцтва індывідуальнага жылля будзе праходзіць шляхам забудовы тэрыторыі з акцэнтам на стварэнне экалагічна спрыяльных умоў жыццядзейнасці, камфортнага асяроддзя пражывання з захаваннем існуючых прыродных комплексаў, а таксама развіццём безбар'ернага асяроддзя, якое неабходна для сацыяльнай інтэграцыі людзей і самастойнай дзейнасці ўсіх катэгорый грамадзян, уключаючы фізіча аслабленых асоб.

«Комплексную індывідуальную забудову лепш ажыццяўляць адным забудоўшчыкам, у тым ліку для ўпарадкавання і паляпшэння архітэктурнага аблічча населеных пунктаў. Станоўчыя аспекты комплекснай індывідуальнай жылой забудовы заключаюцца ў тым, што такія жылыя дамы грамадзяне атрымаюць ва ўстаноўленыя тэрміны, будзе выключана практыка ўзвядзення будынкаў-даўгабудаў, якія парушаюць агульную дызайнерскую канцэпцыю жылых раёнаў», — дадаў Уладзіслаў Шапавалаў.

Пры комплекснай забудове забудоўшчыкам з'яўляецца дзяржаўная арганізацыя. Гэта дазваляе не расцягваць будаўніцтва нашым грамадзянам да пяці-васьмі гадоў (як у сярэднім адбываецца), а пабудаваць і завяршыць усе работы на працягу аднаго года.

Пры ўзвядзенні малапавярховай комплекснай індывідуальнай забудовы мяркуецца ўлічваць патрабаванні па яе транспартнай даступнасці, інжынерным забеспячэнні, а таксама тэндэнцыі да павышэння энергаэфектыўнасці, аўтаномнасці.

## Вялікія ўчасткі без аўкцыёнаў

Для развіцця комплекснага індывідуальнага жыллёвага будаўніцтва Мінбудархітэктуры сумесна з аблвыканкамамі прымаюцца меры па ўдасканаленні нарматыўнай базы і прыцягненні да гэтага працэсу адзінага забудоўшчыка, у асобе УКБ і іншых дзяржаўных будаўнічых арганізацый, якім для гэтай мэты зямельныя ўчасткі даюцца без аўкцыёна.

Гэтая работа дазволіць у найбліжэйшай перспектыве зрабіць упор на маштабнае развіццё комплекснага будаўніцтва індывідуальнага жылля і аб'ектаў інжынернай, транспартнай і сацыяльнай інфраструктуры да такога жылля.

## «Індывідуалы» могуць аб'яднацца ў кааператывы і будавацца з дзяржпадтрымкай

Уладзіслаў Шапавалаў растлумачыў, што пры гэтым, дзеючым заканадаўстве, урэгуляваныя пытанні, якія дазваляюць ажыццяўляць будаўніцтва комплекснай індывідуальнай жылой забудовы УКБ і дзяржарганізацыямі, як шляхам заключэння дагавораў долевага будаўніцтва з грамадзянамі, так і стварэння ЖБВК.

Жыхарам нашай краіны на такое будаўніцтва можа аказвацца дзяржаўная падтрымка, як у рамках Указа Прэзідэнта Беларусі № 13 «Аб некаторых пытаннях прадастаўлення грамадзянам дзяржаўнай падтрымкі пры будаўніцтве (рэканструкцыі) або набыцці жылых памяшканняў» (ільготны крэдыт), так і Указа Прэзідэнта № 240 «Аб дзяржаўнай падтрымцы грамадзян пры будаўніцтве (рэканструкцыі) жылых памяшканняў» (адрасная субсідыя).

Начальнік галоўнага ўпраўлення адзначыў, што міністэрства пільную ўвагу працягвае ўдзяляць цэнам на жыллё. Так, сярэдняя цана аднаго квадратнага метра ў індывідуальным жыллі, якое будуецца з дзяржпадтрымкай, складае 1150 рублёў. А сярэдняя цана аднаго квадратнага метра жылля з дзяржаўнай падтрымкай без уліку індывідуальных забудоўшчыкаў, будзе падтрымлівацца на ўзроўні не вышэй за сярэднюю заработную плату па краіне. Развіццё такіх фінансавых інструментаў, як лізінг жылых памяшканняў, жыллёвыя будаўнічыя зберажэнні, іпатэчнае жыллёвае крэдытаванне будуць спрыяць росту попыту насельніцтва на жыллё

У абласцях ужо рэалізуюцца некаторыя праекты комплекснай індывідуальнай жылой забудовы. Так, напрыклад, у Оршы забудоўшчык УКБ ажыццяўляе комплекснае будаўніцтва індывідуальных жылых дамоў (кватэр). У 2020 годзе ўведзена ў эксплуатацыю жылых дамоў агульнай плошчай 4691 квадратны метр. У Гомельскай вобласці УКБ у якасці інжынірынгавай кампаніі прапануе грамадзянам свае паслугі па вядзенні працэсу будаўніцтва індывідуальных жылых дамоў, афармленні дакументаў, у тым ліку па ўводзе ў эксплуатацыю жылога дома.

Трэба вельмі пастарацца, каб у 2021 годзе значна павялічыць аб'ёмы будаўніцтва комплекснай індывідуальнай жылой забудовы, у першую чаргу, у канструкцыях БПД і такая задача пастаўлена мясцовым выканаўчым і распарадчым органам, адзначыў суразмоўнік.

## Мінскі рэгіён — па спецыяльнай праграме

Адказваючы на пытанне пра Мінск, чыноўнік адзначыў, што ў сталіцы цяжка выдзеліць вялікі ўчастак для комплекснай індывідуальнай забудовы:

— У Мінскім раёне такія ўчасткі таксама пакуль не сфарміраваныя, бо вельмі мала зямель пад будаўніцтва. Жыллё для мінчан будуецца ў тым ліку і ў гарадах-спадарожніках. Па Мінскай вобласці разглядаецца некалькі варыянтаў, дзе можна размясціць раёны комплекснай індывідуальнай забудовы.

**Прадугледжана паэтапнае павелічэнне аб'ёмаў жыллёвага будаўніцтва. Так, з 2021 па 2025 гады аб'ём уводу жылля вырасце з 4 млн квадратных метраў у год да 4,5 млн «квадратаў» адпаведна. Забяспечанасць жыллём, адпаведна, павысіцца да 2025 года да 28,5 квадратнага метра на чалавека.**

Высокі попыт на персанальныя дамы ў Любані, бо там ідзе будаўніцтва горнаўзбагачальнага камбіната, і трэба жыллё для яго спецыялістаў. У Лагойску заканчваецца работа па новай горадабудаўнічай дакументацыі, таму гаварыць аб індывідуальным будаўніцтве пакуль рана. У гарадской мяжы Заслаўя мала месца ў прынцыпе, плюс там складаныя інжынерна-геалагічныя ўмовы. А ў Фаніпалі і Смалявічах актыўна працягнецца будаўніцтва вышыннага жылля дзякуючы наяўнасці развітой інфраструктуры і гатовых інжынерных сетак.

Калі казаць пра глабальныя планы дзяржавы, то ўпор робіцца на развіццё населеных пунктаў, дзе жыве менш за 20 тысяч чалавек. Акцэнт ставіцца на комплекснае будаўніцтва: забудоўваюць вялікія зямельныя ўчасткі «пад ключ» і прадаюць ужо гатовыя дамы.

**Сяргей КУРКАЧ.**

---

Стандарты

# КАБ ВЫХОДЗІЦЬ НА ЗНЕШНІЯ РЫНКІ

## з канкурэнтаздольнай прадукцыяй

**На выніковай калегіі Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі старшыня гэтага ведамства Валянцін ТАТАРЫЦКІ адзначыў, што за мінулую пяцігодку сістэма Дзяржстандарта практычна з усімі паказчыкамі справілася.**

Толькі летась у нашай краіне было прынята больш за 730 дзяржаўных стандартаў. У прыватнасці, былі прыняты 158 СТБ, а таксама 575 ДАСТаў. З іх 106 СТБ і 278 ДАСТаў гарманізаваны з міжнароднымі і еўрапейскімі патрабаваннямі. «Гэта прыстойны ўзровень, які зняў напружанасць па розных кірунках у машынабудаванні, дрэваапрацоўцы і іншых галінах», — заявіў Валянцін Татарыцкі. Асобна старшыня камітэта адзначыў дынаміку росту інвестыцый — 250 % за пяць апошніх гадоў.

Было заўважана, што ўжыванне гарманізаваных стандартаў дае беларускім вытворцам гатовыя тэхнічныя рашэнні, распрацаваныя сусветнымі лідарамі прамысловасці і прызнаныя на міжнародным ці рэгіянальным узроўні. Пры выкарыстанні такіх стандартаў ствараюцца ўмовы для выпуску прадукцыі, канкурэнтаздольнай не толькі на ўнутраным рынку, але і за яго межамі.

Новыя стандарты датычыліся розных галін эканомікі і сацыяльнай сферы. Так, прынята восем дзяржстандартаў, накіраваных на садзейнічанне паэтапнаму зніжэнню выкарыстання палімернай упакоўкі з замяшчэннем яе на экалагічна бяспечную. Гэтыя стандарты датычацца пацвярджэння біяраскладальнасці пластмас і дазволяць ствараць сістэму кантролю пры вытворчасці біяраскладальных матэрыялаў у нашай краіне.

У адпаведнасці з дзяржпраграмай «Навукаёмістыя тэхналогіі і тэхніка» на 2016—2020 гады распрацавана **48 праектаў дзяржаўных стандартаў у галіне электратранспарту.** Таксама зацверджаны два дзяржстандарты на спартыўныя трэнажоры.

У планах на будучую пяцігодку — развіццё сістэмы фонду стандартаў. Кіраўнік камітэта рэкамендаваў усім галінам, канкрэтным прадпрыемствам актыўна ўключацца ў гэтую работу. І калі ёсць прапановы і ідэі, то такія праекты можна і трэба рэалізоўваць. Ён адзначыў, што прапрацоўваецца пытанне стымулявання суб'ектаў гаспадарання, якія актыўна займаюцца пытаннямі стандартызацыі. Дзяржстандарт мае намер ініцыіраваць стварэнне механізмаў для кампенсацыі дзяржавай часткі выдаткаў кампаній пры фінансаванні такіх распрацовак.

Сёлета прадугледжаны работы па 414 тэмах. Сярод іх — распрацоўка васьмі змяненняў да тэхнічных рэгламентаў ЕАЭС (Мытнага саюза) на парфумерна-касметычную прадукцыю, маркіроўку харчовай прадукцыі, цацкі, машыны і абсталяванне, змазачныя матэрыялы, упакоўку, абмежаванне прымянення небяспечных рэчываў у вырабах электратэхнікі і радыёэлектронікі.

Для розных галін эканомікі будуць распрацаваны 309 дзяржаўных стандартаў (СТБ, ДАСТ) і змяненняў да іх, з якіх 234 будуць гарманізаваны з міжнароднымі і еўрапейскімі стандартамі.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Беларусь памятае

# «ЧОРНЫ ЭШАЛОН» ХРАБРАЦОЎ

## У Жлобінскім раёне ўвекавечылі памяць чыгуначніка, чый подзвіг паўплываў на ўвесь ход Вялікай Айчыннай

**Чыгуначная станцыя Красны Бераг на лініі Жлобін — Асіповічы Гомельскага аддзялення Беларускай чыгункі — не самая значная па памеры і папулярнасці. Але менавіта тут адбылася падзея, якая, па ацэнках гісторыкаў, паўплывала на ход Вялікай Айчыннай вайны.**

Сёння станцыя Красны Бераг — прыклад таго, як захоўваецца гісторыя аб мала каму вядомых героях вайны. Памяць чыгуначніка Рыгора Навуменкі — сувязнога партызанскага атрада — тут увекавечылі мемарыяльнай дошкай. Яна нагадвае нашчадкам аб унікальнай аперацыі па выяўленні і знішчэнні эшалона нямецка-фашысцкіх захопнікаў з хімічнай зброяй. Менавіта тут 5 чэрвеня 1943 года на перагоне Красны Бераг — Малевічы спецгрупа «Храбрацы» пусціла пад адхон «чорны састаў» сакрэтнага прызначэння.

На тэрыторыі Беларусі дыверсійная група Народнага камісарыята дзяржаўнай бяспекі БССР «Храбрацы» дзейнічала з 1942 года. На яе рахунку — звыш ста аперацый. Але найбольш адметную групу правяла менавіта на Красным Беразе. Сувязны чыгуначнік Рыгор Навуменка паведаміў у партызанскі атрад, што на станцыі ў тупіку ўзмоцнена ахоўваецца эшалон. Усе яго вагоны, за выключэннем першага і апошняга, былі закрытыя чорным палатном.



У пачатку і канцы саставу на адкрытых платформах былі ўстаноўлены буйнакаліберныя зенітныя кулямёты. Чыгуначнік Рыгор Навуменка перадаў інфармацыю аб далейшым маршруце эшалона. Высветлілася, што ў вагонах знаходзіліся боепрыпасы з атрутным рэчывам, якія гітлераўцы планавалі прымяніць на Курскай дузе. Камандзір дыверсійнай групы Рыгор Ігнатаў атрымаў баявую задачу — перашкодзіць гітлераўцам ажыццявіць свае планы. Дыверсійная група разам з сувязнымі-чыгуначнікамі пусціла эшалон пад адхон. З месца аперацыі ў Маскву перадалі балон з газам, супрацьіпрытную накідку, процівагаз і дегазацыйныя парашкі.



— Трафеі, адпраўленыя ў Маскву, сталі важным доказам планаў гітлераўцаў прымяніць баявыя атрутныя рэчывы на Курскай дузе, — нагадваюць аб значнасці аперацыі на Красным Беразе супрацоўнікі РУП «Гомельскае аддзяленне Беларускай чыгункі». — Пасля гэта дазволіла краінам антыгітлераўскай кааліцыі перайсці да рашучых дзеянняў.

Аб подзвігу земляка жыхары Краснага Берага ведалі даўно. Яшчэ ў 1970-х гадах пры жыцці Рыгора Навуменкі аб ім пісалі ў часопісе «Нёман». Знаёмствам з ім ганарыліся. Але больш шырока пра аперацыю на станцыі Красны Бераг стала вядома дзякуючы геаграфу, краязнаўцу, сацыяльнаму педагогу Гомельскага абласнога ліцэя Аляксандру Пабалаўцу.

— Ужо 10 гадоў я збіраю матэрыялы пра Красны Бераг, — дзеліцца краязнавец. — Гэта мая малая радзіма. Усё, што звязана з гэтым месцам, мне вельмі дарагое. Сабраныя матэрыялы сталі асновай трылогіі. Гэта ўнікальная гістарычная падзея для ўсёй Беларусі. Цяжка ўявіць, што было б, калі не тая аперацыя, і эшалон з атрутнымі газамі прыбыў да месца прызначэння. Але гісторыя не мае ўмоўнага ладу. Мы працуем з фактамі. Пра гэты факт ведалі і Сталін, і Чэрчыль.

Між тым, вядома, што чыгуначнік Рыгор Навуменка і камандзір дыверсійнай групы Рыгор Ігнатаў былі адзначаны высокімі ўрадавымі ўзнагародамі.

— Адкрыццё мемарыяльнай дошкі — гэта наш уклад у работу па захаванні памяці супрацоўнікаў органаў дзяржаўнай бяспекі, а таксама патрыётаў з ліку работнікаў Беларускай чыгункі, якія сваім гераізмам набліжалі Вялікую Перамогу, — падкрэсліў падчас цырымоніі адкрыцця мемарыяльнай дошкі намеснік начальніка Беларускай чыгункі Пётр Стоцкі.

Падчас Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Беларусі дзейнічала 38 спецгруп Наркамата дзяржаўнай бяспекі. Гэтыя старонкі ваеннай гісторыі вядомыя, хоць у закрытых архівах застаецца яшчэ шмат неапублікаванага. Старшыня Гомельскага абласнога аддзялення Беларускай грамадскай арганізацыі ветэранаў КДБ «Гонар» Васіль Коласаў упэўнены, што яшчэ ёсць нямала цікавых фактаў, якія дададуць старонак у летапіс Вялікай Айчыннай вайны. Увогуле, усе ўдзельнікі мерапрыемства шмат казалі аб значнасці пастаяннай работы па захаванні гістарычнай памяці і выхаванні патрыятычнага духу.

Ваенны камісар Гомельскай вобласці Андрэй Крываносаў прапанаваў чыгуначнікам укараніць новую традыцыю — падчас праезду праз станцыі, дзе ўстаноўлены мемарыяльныя дошкі героям, падаваць трайны гукавы сігнал. На яго думку, так работнікі чыгункі і пасажыры будуць адчуваць значнасць і сімвалізм памятных мясцін, аддаваць даніну павагі памяці герояў, якія адстаялі беларускую зямлю.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА,**
**фота БелТА.**

Сацыяльны вектар

# ЛЕЧАЦЬ БЕЗ ГОРКІХ ТАБЛЕТАК

**У Магілёўскай абласной клінічнай бальніцы пацыенты пасля перанесенай пнеўманіі, у тым ліку асацыяванай з інфекцыяй COVID-19, могуць прайсці курс комплекснай рэабілітацыі. Тут для гэтага ёсць усе магчымасці. Для барацьбы з хваробай медыкі выкарыстоўваюць тэхналогіі лячэбнай фізкультуры, апаратнай фізіятэрапіі, масаж і іншыя метады рэабілітацыі.**



А нядаўна фізіятэрапеўтычнае аддзяленне гэтай бальніцы папоўнілася новай медтэхнікай, якая прызначана для прафілактыкі і лячэння розных захворванняў, а таксама для комплекснай рэабілітацыі пасля перанесенай пнеўманіі, у тым ліку асацыяванай з інфекцыяй COVID-19. Як адзначылі медыкі, гэтыя апараты запатрабаваныя сярод пацыентаў, якія лечацца стацыянарна і амбулаторна.

— Да нас паступілі новыя інгалятары-небулайзеры. Даўно вядома, што інгаляцыйная тэрапія — даволі эфектыўны і параўнальна хуткі метад лячэння шматлікіх захворванняў дыхальных шляхоў. Сучасныя апараты дазваляюць рэгуляваць памер часціц, хуткасць распылення лекавых рэчываў, што важна для больш выбарачнага ўздзеяння на верхнія або ніжнія дыхальныя шляхі, — удакладняе **загадчык фізіятэрапеўтычнага аддзялення Магілёўскай абласной клінічнай бальніцы Наталля ДАБРАНСКАЯ.** — Матэрыяльная база нашага аддзялення папоўнілася і сучасным апаратам лазератэрапіі (методыка лячэння на ім заснавана на ўжыванні лазераў з рознымі характарыстыкамі, што ўзмацняе лячэбны эфект), а таксама партатыўнымі апаратамі магнітатэрапіі. Іх перавага ў тым, што яны дазваляюць ажыццяўляць выкананне працэдур у палатах аддзялення. А зараз гэта не толькі важна, а і асабліва запатрабавана.

Медыкі падкрэсліваюць, што рэабілітацыя пасля пнеўманіі — адзін з важных этапаў для добрага самаадчування, бо пасля праходжання курса медыкаментознай тэрапіі ў вострым перыяд многія пацыенты скардзяцца на тое, што ім яшчэ цяжка весці звыклы лад жыцця.

— Наша медыцынская рэабілітацыя накіравана на поўнае або частковае аднаўленне функцый органаў і сістэм арганізма, парушаных у выніку пнеўманіі, у тым ліку асацыяванай з інфекцыяй COVID-19, прафілактыку магчымых ускладненняў, аднаўленне нармальнай жыццядзейнасці пацыента, — тлумачыць Наталля Дабранская. — Пацыенты ў нас атрымліваюць апаратную фізіятэрапію, масаж, вучацца правільна выконваць дыхальныя і агульнаўмацавальныя практыкаванні. Да кожнага — індывідуальны падыход.

**Таццяна МАЛІНІНА,**
**фота аўтара.**



Разам

## Ігар ПЕТРЫШЭНКА: «ПАТРЫЯТЫЧНАЕ ВЫХАВАННЕ ПАВІННА АТРЫМАЦЬ НОВЫ ІМПУЛЬС»

### У Гродне прайшоў рэспубліканскі семінар па ідэалагічнай і выхаваўчай рабоце сярод моладзі

**Плануецца, што многія ключавыя пазіцыі будуць пакладзены ў дзяржаўную праграму патрыятычнага выхавання насельніцтва, распрацоўка якой пачалася пасля правядзення VI Усебеларускага сходу. Эксперты звярнулі ўвагу на работу з моладдзю і абмеркавалі шляхі яе ўдасканалення. Лейтматывам можна лічыць адказ на пытанне: што трэба зрабіць, каб праграма атрымала адпаведны водгук у моладзі і не стала наборам мерапрыемстваў.**


www.grodnonews.by

Сярод удзельнікаў семінара — прадстаўнікі ўрада, абласной вертыкалі, дэпутаты Нацыянальнага сходу, прадстаўнікі дзяржаўных грамадскіх аб'яднанняў, рэктары ўніверсітэтаў, духавенства. На іх разгляд было вынесена пытанне па актуальных аспектах арганізацыі выхаваўчай і ідэалагічнай работы ў сістэме адукацыі Рэспублікі Беларусь і шляхі яе ўдасканалення.

Падчас адкрыцця семінара **міністр адукацыі Ігар КАРПЕНКА** зазначыў, што чатыры гады таму ў Гродне праводзілася падобнае мерапрыемства, дзе ішло абмеркаванне новых формаў ідэалагічнай і выхаваўчай работы. Дзяржавай выбудавана сістэма сацыяльнай падтрымкі моладзі — ад адукацыі да працаўладкавання і дапамогі маладым спецыялістам і іх сем'ям. Але падзеі ў свеце і ў краіне сведчаць, што гэтага ўжо недастаткова. На першы план выходзіць выхаванне грамадзян. Падчас Усебеларускага сходу кіраўніком дзяржавы пастаўлена задача распрацаваць комплексную праграму патрыятычнага выхавання.

— Работа ў гэтым кірунку вядзецца, — паведаміў міністр адукацыі. — Гэта і работа дыялогавых пляцовак, і сустрэчы са студэнтамі, і, у тым ліку, чарговы прадстаўнічы семінар. У цэлым, падыходы да распрацоўкі праграмы і яе канцэпцыя вызначаны. У найбліжэйшы час будзе створана міжведамасная група, дзе канкрэтныя прапановы будуць сістэматызаваны. Таксама паралельна вядзецца работа па ўдасканаленні стратэгіі дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі і распрацоўцы канцэпцыі адукацыі да 2035 года, дзе значнае месца будзе аддадзена менавіта пытанням патрыятычнага выхавання.

На думку **намесніка прэм'ер-міністра Беларусі Ігара ПЕТРЫШЭНКІ,** выхаваўчая работа па фарміраванні грамадзянскіх, патрыятычных якасцяў павінна атрымаць новы імпульс. На заклікі і лозунгі маладыя людзі часцей за ўсё зараз не адгукаюцца. Яны хочуць, каб з імі размаўлялі на роўных, каб іх чулі. Вось гэта і варта выкарыстоўваць.

— Трэба ўтвараць дыялогавыя перагаворныя пляцоўкі з кіраўніцтвам, бізнесам, духавенствам і прадстаўнікамі іншых сфер. Толькі ў такіх жывых зносінах можам вызначыць і ўзяць на ўзбраенне прывабныя формы работы па выхаванні ў дзяцей патрыятызму і грамадзянскай адказнасці. Такая работа павінна атрымаць новае дыханне. Пакуль на цяперашнім этапе ёсць разрозненасць, — заўважыў віцэ-прэм'ер.

Па словах Ігара Петрышэнкі, важна ўзмацніць такое звяно, як школа. Менавіта тут пачынаюць фарміравацца важныя жыццёвыя арыенціры, грамадзянскі і маральны стрыжань. Так склалася, што менавіта гэтыя ўстановы з'яўляюцца цэнтрам выхаваўчай работы падрастаючага пакалення. Між тым не заўсёды педагогі паспяваюць за выклікамі часу. Не ўсе з іх, у прыватнасці, валодаюць вопытам работы з сацыяльнымі сеткамі. А гэта сёння важны складнік узаемадзеяння з моладдзю. Таму патрэбны навучальныя курсы для педагогаў-прадметнікаў і класных педагогаў. Трэба, каб педагог быў прыняты і запатрабаваны ў інтэрнэт-прасторы. Таксама было агучана і пытанне празмернай загрузкі настаўніка непатрэбнай папяровай работай. Гэту праблему даручана дэтальна разгледзець Міністэрству адукацыі.

З педагогаў будзе і асаблівае патрабаванне. Дзяржава, у сваю чаргу, стварае для іх спрыяльныя ўмовы працы. І гэты кірунак працягваецца. Будзе паслядоўна вырашацца пытанне павышэння заработнай платы настаўнікам. Мяркуецца, што да канца бягучай пяцігодкі яна будзе даведзена да 100 % ад узроўню сярэдняй заработнай платы па краіне. Прынята рашэнне і па арэндным жыллі для работнікаў сацыяльнай сферы, у тым ліку работнікаў сістэмы адукацыі.

Яшчэ адной важнай задачай з'яўляецца занятасць моладзі. Эканоміка — гэта той фундамент, які ўмацоўвае грамадзянскія пазіцыі моладзі, робіць патрыятычную базу больш трывалай. Адным з аспектаў замацавання моладзі павінна стаць мэтавая падрыхтоўка, яна будзе пашырацца. Адпаведны праект урадам падрыхтаваны. Гэта дазволіць павялічыць колькасць прынятых на вучобу па мэтавым накіраванні. Непажадана, каб малады спецыяліст пасля адпрацоўкі з'язджаў. Моладзі трэба ствараць спрыяльныя ўмовы для замацавання на рабочых месцах. Варта давесці замацаванне маладых спецыялістаў да 90 %. І за гэтым будзе самы пільны кантроль.

— Мы прынялі дзяржаўную праграму «Адукацыя і маладзёжная праграма» на бягучую пяцігодку. У ёй пастаўлены напружаныя задачы. Да канца 2025 года мы павінны давесці занятасць моладзі да 94 %, зараз гэты паказчык складзе 91,5 %, — адзначыў Ігар Петрышэнка.

І наогул, варта задзейнічаць моладзь ва ўсіх сферах жыцця краіны. Для гэтага неабходна аб'яднаць усе ініцыятывы ў адну цэласную сістэму — школы, сям'і і грамадскасці. Без сумнення, у краіне праводзіцца вялікая колькасць розных мерапрыемстваў патрыятычнай накіраванасці, аднак недастаткова толькі іх пералічваць. Патрыятызм, па словах Ігара Петрышэнкі, варта крок за крокам узгадоўваць ад дзіцячага садка да рабочага месца. І тут важна даць адказ на пытанне: наколькі новае пакаленне разам з ведамі атрымлівае правільныя жыццёвыя арыенціры.

Як вядзецца гэта работа на Гродзеншчыне, расказаў **начальнік галоўнага ўпраўлення адукацыі аблвыканкама Руслан АБРАМЧЫК.** Ён зазначыў, што за апошнія гады рэалізавана мноства ініцыятыў, якія садзейнічаюць выхаванню патрыятызму. У іх ліку «Аўтограф на карце роднай Беларусі», інтэрактыўны інтэрнэт-праект «#Інтэрнэт#Памяць#Будучае.by», у якім, дарэчы, прыняло ўдзел больш за 600 педагогаў, а таксама навучэнцы вобласці. Набыў папулярнасць рэгіянальны экскурсійны праект «Да суседзяў», краязнаўчы праект «Замкі Гродзеншчыны», экскурсійна-пазнавальны конкурс «З міру па нітцы». Усе праекты выклікалі даволі жывы інтарэс у школьнікаў новым падыходам. З такім акцэнтам у вобласці ідзе фарміраванне рэгіянальнай праграмы выхавання дзяцей і вучнёўскай моладзі на пяцігодку. Важнае месца адводзіцца педагогам.

— Сёння яскрава вызначылася патрэба фарміравання новага педагагічнага мыслення педагогаў у ідэалагічным выхаванні. Таму важнай задачай з'яўляецца складванне іміджу сучаснага педагога, які матываваны на самаразвіццё і работу ў сацыяльных сетках, — зазначыў Руслан Абрамчык.

Аб духоўным кодзе беларусаў паразважаў падчас семінара **старшыня Сінадальнага аддзела Беларускай праваслаўнай царквы па супрацоўніцтве з установамі адукацыі Фёдар ПОЎНЫ.** Святар згаджаецца, што школа не павінна быць машынай, а стаць цэнтрам выхавання, дзе фарміруецца асоба. Адпаведна і педагогі павінны мець пад сабой трывалы падмурак. Гэта дазволіць сфарміраваць у юнага беларуса той самы код, які завецца нічым іншым, як кодэксам гонару. А ганарыцца ў Беларусі ёсць чым.

Падчас семінара была агучана дзейнасць БРСМ у выхаваўчай рабоце ўстаноў адукацыі. З місіяй ГрДУ імя Я. Купалы па выхаванні грамадзяніна, патрыёта, сем'яніна выступіла **рэктар Ірына КІТУРКА.** Перспектывы развіцця палітычнага ладу Беларусі акрэсліў **дэкан факультэта філасофіі і сацыяльных навук БДУ Вадзім ГІГІН.** У прыватнасці, ён зазначыў, што зараз ідэалагічная і выхаваўчая работа будзе будавацца па-новаму, і грамадства павінна быць гатова да новых выклікаў.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

Змена

## ПЕРСПЕКТЫЎНАЯ ГЛЫБІНКА

### Старшыня Гомельскага аблвыканкама сустрэўся са студэнтамі і супрацоўнікамі ГДУ

**Падтрымку маладых спецыялістаў, развіццё розных галін і рэгіёна ў цэлым, захаванне гістарычнай памяці аб падзеях Вялікай Айчыннай вайны абмяркоўвалі на сустрэчы старшыні Гомельскага аблвыканкама Генадзя САЛАЎЯ са студэнтамі і супрацоўнікамі Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ф. Скарыны.**

Генадзь Салавей падкрэсліў важнасць такіх сустрэч як аднаго з варыянтаў прамой сувязі ўлады з установамі і прадпрыемствамі. Губернатар расказаў аб сацыяльна-эканамічным развіцці вобласці, паведаміла БелТА. Ён адзначыў, што па выніках мінулага года ВРП вобласці склаў 99,8 % да ўзроўню 2019-га: «Мы ўбачылі, дзе ёсць слабыя месцы, і цяпер сканцэнтравалі ўвагу на гэтых момантах».

Сярод прыярытэтных пры фарміраванні Праграмы развіцця на 2021—2025 гады Генадзь Салавей назваў кірунак «Здаровая сям'я». «Летась былі выдзелены вялікія сродкі для медыцыны, набыта сучаснае абсталяванне, увялі ў строй новую сучасную паліклініку ў Гомелі і іншыя аб'екты. У цэлым за год дадаткова з бюджэту адшукалі Br105 млн для гэтай галіны, бо здароўе чалавека — самае важнае», — падкрэсліў ён.

Драйвер росту эканомікі — у інавацыях, інвестыцыях, перакананы Генадзь Салавей. Чакаецца, што маштабныя праекты будуць рэалізаваны ў дрэваапрацоўцы, металургіі, калійнай прамысловасці, сельскай гаспадарцы і іншых галінах. Актыўна мадэрнізуецца і транспартная інфраструктура.

Старшыня аблвыканкама падкрэсліў важную ролю навукі ў развіцці рэгіёна. «Навацыі, якія гатовыя прапанаваць ад навукі, мы зможам ужываць у вытворчасці», — сказаў ён.

Пытанні, якія задавалі губернатару студэнты і выкладчыкі ўніверсітэта, датычыліся выдзялення жылля маладым спецыялістам, у тым ліку ў сельскай мясцовасці, ільгот, гарантый і іншых відаў падтрымкі для тых, хто прыходзіць на сваё першае рабочае месца.

«На месцах да маладых спецыялістаў павінна быць па-сапраўднаму бацькоўскае стаўленне. Кіраўнікам варта бачыць у новым пакаленні сваіх будучых пераемнікаў і рыхтаваць іх, асабліва гэта актуальна для невялікіх гарадоў, сельскай мясцовасці. Не трэба сцягваць усіх у вялікія гарады», — сказаў Генадзь Салавей. Ён звярнуў увагу, што віды падтрымкі, у тым ліку і па чарнобыльскіх рэгіёнах, рэгламентаваны нарматыўнымі дакументамі. Дадатковыя бонусы агаворваюцца і ў калектыўных дагаворах.

Што датычыцца жылплошчы для маладых спецыялістаў, то тут варта развіваць будаўніцтва арэнднага жылля, адзначыў губернатар. Абмеркавалі на сустрэчы тэму замацавання маладых спецыялістаў і тое, як не дапусціць адтоку з рэгіёна высокаматываваных выпускнікоў і школ, і ВНУ. Па словах Генадзя Салаўя, замацаванне маладых спецыялістаў у рэгіёне вар'іруецца ад 50 % да 90 %. «Наша задача, каб нашы кадры засталіся ў вобласці», — падкрэсліў ён. І гэта шмат у чым залежыць ад пазіцыі канкрэтных прадпрыемстваў, іх кіраўнікоў. Для падрыхтоўкі і замацавання маладых спецыялістаў варта больш актыўна выкарыстоўваць мэтавыя накіраванні, звярнуў увагу кіраўнік вобласці.

Студэнтка ўніверсітэта папрасіла губернатара падтрымаць ідэю пабудаваць пры ВНУ адкрытую спартыўную пляцоўку, на якой маглі б рыхтавацца да спаборніцтваў спартсмены, а ў вольны час з карысцю бавіць час гараджане. «Падумаем, як падставіць плячо. Магчыма, як варыянт, ад сродкаў, заробленых на суботніку, або праз іншыя крыніцы», — адказаў Генадзь Салавей. Ён падкрэсліў, што спартыўная інфраструктура вобласці развіваецца. Летась у Гомелі ўвялі ў эксплуатацыю два басейны. У кожным раёне абласнога цэнтра абсталявалі спартыўныя комплексы. Будуюцца пляцоўкі і ў шасці раёнах вобласці. Ёсць ідэя ў найбліжэйшыя гады пабудаваць шматкіламетровую веладарожку ў Гомелі. «Вядома, варкаўт-пляцоўкі з гульнявымі зонамі вельмі патрэбныя, бо прафесійны шлях многіх спартсменаў пачынаецца менавіта з дваровага спорту», — лічыць старшыня аблвыканкама.

Ішла на сустрэчы гаворка і пра запланаваную рэканструкцыю мемарыяльнага комплексу «Партызанская крынічка» на месцы базіравання партызанскага атрада «Бальшавік» пад Гомелем, і ў цэлым пра тое, як важна захаваць гістарычную праўду пра падзеі Вялікай Айчыннай вайны.

# ШКАЛА БЯСПЕКІ

## Спецыялісты расказалі пра асаблівасці функцыянавання АЭС

**Завяршальны этап уводу ў эксплуатацыю першага энергаблока БелАЭС, прыёмка якога чакаецца ў сакавіку—маі, утрымлівае ў сабе яшчэ мноства разнастайных мерапрыемстваў і выпрабаванняў, у тым ліку з паніжэннем магутнасці рэактара, а таксама са спыненнем блока. Пасля чарговага перапынку ён запрацуе, як плануецца, у канцы лютага. Пра гэта, а таксама пра кантроль за станам АЭС у рэжыме рэальнага часу і дзеянні ў выпадку разнастайных здарэнняў на станцыі расказалі эксперты Дзяржатамнагляда падчас брыфінгу ў БелТА.**



Фота БелТА.

### Спачатку ліцэнзія, пасля — прыёмка

Комплексная і дынамічныя выпрабаванні на станцыі падчас этапу доследна-прамысловай эксплуатацыі (этап Г) працягнуцца да прыёмкі ў прамысловую эксплуатацыю. Увесну будзе працаваць прыёмачная камісія, якая зацвярджаецца на ўзроўні распараджэння прэм'ер-міністра. Умовай для пачатку работы павінна быць праведзеная поўная самаацэнка станцыі па ступені яе гатоўнасці да эксплуатацыі, а таксама выдача ўсімі наглядным органамі адпаведных станоўчых заключэнняў. А найважнейшай умовай стане атрыманне ліцэнзіі на эксплуатацыю энергаблока № 1 ад МНС, расказаў **Леанід ДЗЯДУЛЬ, першы намеснік начальніка Дэпартамента па ядзернай і радыяцыйнай бяспецы МНС (Дзяржатамнагляда):**

*— На ўсіх этапах уводу станцыі ў эксплуатацыю выдаваліся дазволы на выкананне пэўных праграм. І перад прыняццем кожнага такога рашэння праводзіліся мэтавыя інспекцыі. Перш чым атрымаць дазвол на ліцэнзію, таксама правядуць выязную інспекцыю, якая ацэніць фізічны стан адпаведнасці канструкцый і сістэм, гатоўнасць персаналу, культуру бяспекі. Адбудуцца абавязковыя грамадскія слуханні, дзе прадставяць інфармацыю аб выніках. Мы будуем станцыю для сябе, і яна павінна адпавядаць нашым і міжнародным нормам і правілам, а многія знешнія заўвагі, якія публікуюцца ў СМІ, можна сказаць, беспадстаўныя. Тыя, хто хоча разабрацца, наведвае пляцоўку і ўдзельнічае ў рабоце.*

Летам у Беларусь прыедзе чарговая інспекцыя місіі МАГАТЭ па фізічнай абароне, а ў канцы года плануецца місія па рэгулюючай дзейнасці.

### Сем узроўняў шкалы ацэнкі ядзернай бяспекі

Падзеі, якія адбываюцца на станцыі на этапе доследна-прамысловай эксплуатацыі першага энергаблока, выклікаюць павышаную цікавасць не толькі ў Беларусі, але і па-за яе межамі. Увага да аб'екта значна павысілася яшчэ з моманту завоза на пляцоўку АЭС свежага ядзернага паліва, заўважыў Леанід Дзядуль:

*— Для разумення ступені небяспекі той ці іншай з'явы, што адбываецца на пляцоўцы АЭС, важна наяўнасць класіфікатара зразумелай усім шкалы. У дачыненні да ядзерных з'яў для аднастайнасці іх ацэнкі МАГАТЭ выкарыстоўваецца шкала INES. Яна прымяняльная ў тым ліку да перавозкі, захоўвання і выкарыстання ядзерных матэрыялаў і крыніц іанізуючага выпраменьвання, а таксама ўключае ў сябе пагрозу іх страты ці крадзяжу.*

У межах шкалы падзеі класіфікуюцца па сямі ўзроўнях. Ад першага да трэцяга ўзроўню яны называюцца інцыдэнтамі, а ад чацвёртага да сёмага — аварыямі. Пры гэтым кожны ўзровень характарызуецца яшчэ вобласцю ўздзеяння на насельніцтва і навакольнае асяроддзе, радыелагічным бар'ерам і кантролем і глыбокаэшаланіраванай абаронай.

Здарэнні, якія лічацца неістотнымі з пункту гледжання ядзернай і радыяцыйнай бяспекі, вызначаюцца як адхіленні, кваліфікуюцца як выпадкі ніжэй за шкалу INES, г. зн. нулявога ўзроўню, падкрэсліў спецыяліст:

*— А з'явы, якія класіфікуюцца ў межах шкалы, у той ці іншай ступені звязаны з выкідам радыеактыўных рэчываў, атрыманнем персаналам і насельніцтвам адпаведнай дозы апраменьвання, са стратай кантролю над крыніцамі іанізуючага выпраменьвання.*

МАГАТЭ рэкамендуе апавяшчаць усіх краін-удзельніц на працягу сутак з моманту здарэння ўсіх аварый, вышэйшых за другі ўзровень. Гэта дазваляе своечасова праінфармаваць насельніцтва аб здарэнні. На сёння пад сёмы ўзровень па гэтай шкале падпадае інфармацыя пра аварыі на ЧАЭС і Фукусіме, а пад шосты — на хімкамбінаце «Маяк», удакладніў эксперт:

*— Каб своечасова інфармаваць пра здарэнні, Беларуссю заключаны розныя пагадненні з усімі краінамі, якія мяжуюць з нашай дзяржавай, а таксама з Арменіяй і Аўстрыяй. Гэтыя пагадненні датычацца не толькі апавяшчэння аб аварыях, але і аб стане ядзернай і радыяцыйнай бяспекі ўстановак. Беларусь добраахвотна (хоць магла б гэтага і не рабіць) праінфармавала пералічаныя краіны пра завоз на АЭС паліва, яго загрузку ў рэактар і пачатак фізічнага пуску.*

### Пяць літар «А» і дзесяць літар «П»

Не ўсё, што адбываецца на АЭС па-за межамі яе нармальнага функцыянавання, лічыцца аварыяй, запэўніў **Віген МАРУХЯН, начальнік упраўлення рэгулявання ядзернай бяспекі Дэпартамента па ядзернай і радыяцыйнай бяспецы МНС (Дзяржатамнагляд)** і расказаў, якая падзея што азначае.

**Аварыя** — парушэнне нармальнай эксплуатацыі станцыі, падчас якога адбыўся выкід радыеактыўных рэчываў за межы, прадугледжаныя праектнай дакументацыяй. **Парушэнне** ў рабоце блока атамнай станцыі — любая падзея, якая прывяла да аварыі або здарэння. **Здарэнне** — парушэнне, якое характарызуецца адхіленнем ад нармальнай эксплуатацыі, што выклікана адмовай сістэмы бяспекі АЭС. **Падзея** — любы дэфект, пашкоджанне ці наўмыснае дзеянне аператара (уключаючы памылку персанала) падчас эксплуатацыі блока. Сюды ж адносяцца адмова абсталявання і іншыя непаладкі.

*— Адпаведна з тым, якой катэгорыяй характарызуецца тое, што здарылася на станцыі, прадугледжана і рэагаванне. Патрабаванне аб неабходнасці паведамлення Дзяржатамнагляду пра падзеі і парушэнні на АЭС устаноўлена ў дакументах «Агульныя палажэнні забеспячэння бяспекі атамных станцый» (гэта асноўны дакумент пры эксплуатацыі блока АЭС) і «Патрабаванні да парадку расследавання і ўліку парушэнняў», якія зацверджаны Пастановай № 52 МНС, — расказаў ён. — Трэцяя частка гэтай працэдуры — устанаўленне дадзеных патрабаванняў ва ўмовах дзеяння ліцэнзіі блока АЭС, адпаведна з якім адбываецца апавяшчэнне, далейшае расследаванне і карэкцыйныя мерапрыемствы.*

Згодна з Патрабаваннямі, вызначана пяць катэгорый аварый, якія абазначаны літарай «А», — ад 01 да 05 — і дзесяць катэгорый здарэнняў — абазначаны літарай «П» — ад 1 да 10.

— Пяць катэгорый першых аварый суправаджаюцца выкідам радыеактыўных рэчываў і іанізуючых выпраменьванняў. І адпаведна з гэтым адбываецца апавяшчэнне і расследаванне гэтых падзей. Астатнія падзеі, абазначаныя ў дакуменце, расследуюцца на ўзроўні эксплуатуючай арганізацыі (атамнай станцыі), якая абавязана на працягу 30 хвілін апавясціць Дзяржатамнагляд пра падзеі і парушэнні, якія адбываюцца на блоку АЭС вусна. А пасля прадставіць справаздачу аб расследаванні і прынятых мерах, — удакладніў Віген Марухян.

### Для кантролю і прагнозаў

Кантроль за бяспечным станам АЭС Дзяржатамнагляд ажыццяўляе ў спецыяльным інфармацыйна-аналітычным цэнтры. Сюды па адмыслова выдзеленых каналах у рэжыме рэальнага часу паступаюць тэхналагічныя і радыяцыйныя параметры (унутры памяшканняў і на прамысловай пляцоўцы), якія характарызуюць стан энергаблока станцыі. Кантралююць гэтыя параметры спецыяльна створаныя пяць рабочых груп, расказала **Вікторыя АНТОНАВА, начальнік упраўлення рэгулявання радыяцыйнай бяспекі Дэпартамента па ядзернай і радыяцыйнай бяспецы МНС (Дзяржатамнагляд):**

*— У цэнтры ёсць праграмныя сродкі, якія дазваляюць не толькі ацэньваць бягучае становішча на АЭС, але і пры нейкіх падзеях прагназаваць іх наступствы. У прыватнасці, праграмныя коды дазваляюць ацаніць, што пагражае насельніцтву пры выкідах радыеактыўных рэчываў, і ступень забруджвання тэрыторыі. Пры гэтым улічваюцца напрамак ветру, ападкі, ландшафт. З моманту завозу паліва на пляцоўку ў маі 2020-га цэнтр перайшоў на кругласутачнае дзяжурства.*

Падобныя цэнтры ёсць і ў іншых ведамствах. У Мінпрыроды свой сітуацыйны цэнтр, які, пры неабходнасці, кантралюе радыеактыўнае забруджванне асяроддзя. А сітуацыйны цэнтр Міністэрства аховы здароўя адказвае за ацэнку прагназавання доз апраменьвання насельніцтва.

Дзяржатамнагляд праводзіць рэгулярныя трэніроўкі, у тым ліку і сумесна з іншымі ведамствамі, каб адпрацоўваць магчымыя сітуацыі. А яшчэ ў ведамства ёсць мабільная лабараторыя радыяцыйнага кантролю. Гэта дапаможны інструмент Дзяржатамнагляда, які выкарыстоўваецца як незалежны сродак падчас ацэнкі радыяцыйнай абстаноўкі пры інспектаванні радыяцыйных аб'ектаў.

❍ У тэму

# КОЛЬКІ РАЗОЎ МОЖНА СПЫНЯЦЬ АЭС

## Віген МАРУХЯН: калі рэактар адключаецца ад энергасістэмы, ён працягвае працаваць

Перыядычныя адключэнні энергаблока падчас правядзення выпрабавання абсталявання, што выклікаюць неадназначныя рэакцыі, нельга разглядаць як спыненне яго работы, бо фактычна ён не эксплуатуецца. У сусветнай ядзернай практыцы існуе дакладная тэрміналогія адносна абазначэння асаблівасцяў працэсаў, якія адбываюцца ў рабоце АЭС падчас яе падрыхтоўкі да пуску і непасрэдна на этапе эксплуатацыі. Гэтыя адрозненні карэспандэнту «Звязды» растлумачыў **Віген МАРУХЯН, начальнік упраўлення рэгулявання ядзернай бяспекі Дэпартамента па ядзернай і радыяцыйнай бяспецы МНС (Дзяржатамнагляд).**

***— Чаму энергаблок выпрацоўвае электраэнергію, але нельга сказаць, што ён працуе?***

*— У энергасетку краіны станцыя ўвайшла на этапе энергапуску ў межах выпрабаванняў, каб паглядзець, як блок працуе пры выдачы ў сетку. Ён выпрацоўвае электраэнергію цяпер, аднак у межах той працэдуры, якая* ***вызначана ўводам блока***



Фота БелТА.

***ў эксплуатацыю, а не яго эксплуатацыяй. Гэта два розныя тэрміны.*** *Эксплуатацыя блока ў нас яшчэ не пачалася. Толькі калі прыёмачная камісія прыме блок, ён будзе эксплуатавацца.*

Падчас кожнага падняцця магутнасці энергаблока (з аднаго працэнта да 40 % падчас фізпуску, да 50 % на этапе энергапуску, да 75 %, 90 % і 100 %) праводзіцца па 200-300 выпрабаванняў. Гэта робіцца, каб зразумець, на якіх узроўнях магутнасці могуць працаваць пэўныя сістэмы і абсталяванне. У іх розныя тэхналогіі пра рабоце на магутнасці ў 50 %, 70 %, пры выводзе ў рамонт, падчас выпрабаванняў.

***— Ці існуе ў сусветнай практыцы нейкі ўсярэднены параметр адносна таго, колькі разоў можа спыняцца работа АЭС?***

*— Кожнае абсталяванне мае свой рэсурс па адключэннях, напрацоўцы, уключэннях і выключэннях.* Усё гэта апісана ў пашпарце кожнай сістэмы і віду абсталявання. І там напісана, напрыклад, што яго работа разлічана на 30 гадоў на працягу 40 тысяч гадзін, падчас якіх прадугледжваецца, па разліках аналізу надзейнасці (а ён робіцца для ўсіх сістэм бяспекі і абсталявання), напрыклад, 54 адключэнні. Гэта ўмоўна кажучы. Насамрэч, усё гэта разлічваецца з моманту пачатку эксплуатацыі энергаблока (яго прыёмкі камісіяй), а не да таго, як праводзяцца выпрабаванні. Ва ўсім свеце разлікі прадугледжваюцца для эксплуатуемага блоку. Аднак гэтыя разлікі прадугледжваюцца не для станцыі ў цэлым, а ў пашпарце для кожнага віду абсталявання і сістэмы паасобку.

Кожнае спыненне блока ў перыяд яго ўводу ў эксплуатацыю дапускае, што рэактар можа быць разгружаны да 40 % ці 1 %. Гэта можа адбыцца, напрыклад, таму што помпа, якая выпрабоўвалася згодна з праграмай уводу блока ў эксплуатацыю, на магутнасці 50 % і 90 % працавала добра, а на 100 % з прычыны тэхнічнага характару здарылася яе адмова або адключэнне. Адпаведна, трэба панізіць магутнасць блока і спыніць яго, каб праверыць, чаму гэта здарылася, і зрабіць рамонт. Так што ўсе спыненні і пускі блока ў перыяд яго пуску, — гэта выпрабаванні. І нават калі блок адключаецца ад энергасістэмы, ён не спыняецца, а працягвае працаваць.

Увод блока № 1 Беларускай АЭС у эксплуатацыю працягваецца, адбываюцца выпрабаванні і давядзенне характарыстык абсталявання да праектных значэнняў з мэтай іх далейшай бяспечнай эксплуатацыі.

**Матэрыялы падрыхтавала Ірына СІДАРОК.**

# АД ЗАДУМЫ — ДА РЭАЛІЗАЦЫІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар СЕРГЕЕНКА** падчас цырымоніі адкрыцця адзначыў: «Праект, які зарадзіўся дзесяць гадоў таму, стаў традыцыяй сучаснай Беларусі. Ён карыстаецца папулярнасцю і цікавасцю ў моладзі і з кожным годам набірае абароты, пра што гаворыць рост колькасці намінацый. Выдатна, што ў праекце не толькі аспіранты, маладыя навукоўцы, студэнты, але і старшакласнікі, навучэнцы каледжаў. У нашай краіне створаны ўсе ўмовы для выяўлення таленавітых хлопцаў і дзяўчат і развіцця іх творчай ініцыятывы. Адна з галоўных задач Саюза моладзі — прасоўванне гэтых людзей і ўвасабленне іх праектаў у жыццё».



Праект «Бранзалет клопату».

**Першы сакратар Цэнтральнага камітэта БРСМ, член Савета Рэспублікі Дзмітрый ВАРАНЮК** дадаў, што фіналу папярэднічалі многія дні, месяцы і нават гады падрыхтоўкі. «Упэўнены, што для кожнага з прысутных гэта гістарычная падзея. Хтосьці тут набыў новых сяброў, нехта запазычыў для сябе нешта важнае, новае. Але самае галоўнае, разам мы пачынаем рэалізацыю шматлікіх яркіх ідэй. Вы з'яўляецеся патрыётамі, што сёння вельмі важна. Найлепшыя праекты атрымаюць падтрымку, у тым ліку фінансавую, і будуць рэалізаваныя. Галоўнае, каб ідэі былі даведзены да лагічнага завяршэння».

**Намеснік прэм'ер-міністра Ігар ПЕТРЫШЭНКА** звярнуў увагу: «У тых хлопчыкаў і дзяўчынак, якія ўзнагароджаны талентам вынаходніцтва, інавацыйных падыходаў, незалежна ад таго, дзе яны пражываюць, ёсць магчымасць рэалізаваць свае праекты, прадэманстраваць іх. За дзесяць гадоў існавання праекта ад моладзі паступіла 15 тысяч прапаноў, з іх тры тысячы рэалізаваныя. Хачу заклікаць, каб вы не стаялі на месцы. Самае галоўнае, каб напрацоўкі маладых хлопцаў і дзяўчат рэалізоўваліся ў нас у краіне, каб моладзь заставалася тут, атрымлівала адукацыю, якая ў нас на вельмі высокім узроўні. Ад вас залежыць будучыня і развіццё Беларусі — інавацыйнай, перадавой і сацыяльна камфортнай».



«Экапосуд» з Гомельшчыны.

На выстаўцы былі прадстаўлены праекты ў дзесяці намінацыях, усе рознабаковыя: тэхналогіі барацьбы з ракам, інклюзіўныя распрацоўкі, карысная касметыка, мабільныя праграмы... Напрыклад, адны з пераможцаў — **адзінаццацікласнікі сталічнай сярэдняй школы № 111 Максім СУВОРАЎ і Аляксандр МЕЛЬГУЙ** прэзентавалі **«Адукацыйную платформу «БМВ» (Беларуская мова вучням»)**. Яна створана з мэтай укаранення дыстанцыйнага навучання па роднай мове ў перыяд пандэміі. «Платформа дапаможа развіць у вучняў маўленчыя і моўныя кампетэнцыі, паспяхова здаць ЦТ па вучэбным прадмеце, прадугледжвае таксама і абмен інфармацыяй паміж яе карыстальнікамі ў форме чата».

**Вучаніца дзявятага класа той жа школы Ганна БАНДАРОВІЧ і яе кіраўнік Наталля ЧЫРЫЦА** прыдумалі **«Жывую руку»** — праект для дзяцей з ДЦП, скіраваны на аднаўленне функцый руху верхніх канечнасцяў, паляпшэння рухомасці суставаў, карэкцыю рухальных дысфункцый рук. «Адной з эфектыўных і сучасных формаў работы з такімі дзецьмі з'яўляюцца заняткі з выкарыстаннем аўтарскага комплексу, які ў нашым выпадку складаецца з трэнажораў, абсталявання, зробленых з дапаможнага матэрыялу сваімі рукамі, а таксама стварэння кабінета эрга-і механатэрапіі на базе ўстановы адукацыі. Зараз у нашай школе займаюцца дзесяць вучняў з парушэннямі функцый апорна-рухальнага апарату і 18 — з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця», — расказала Наталля Чырыца. Дарэчы, ініцыятыва гэтых распрацоўшчыкаў стала адной з найлепшых у намінацыі «Медыцына, фармацыя, медыцынская тэхніка».

Мабільную праграму **Eng for kids** прэзентавалі **Данііл ВЕЧАР і Лізавета ПІНЧУК, вучні мінскай гімназіі імя У. І. Нявецкага.** «Гэта магчымасць сумяшчаць прыемнае з карысным, не выходзячы з дому. Часта малым складана вывучаць замежную мову без асацыяцый, гульняў, таму мы стварылі такую праграму. З дапамогай тэхналогіі дапоўненай рэальнасці дзеці запамінаюць удвая больш інфармацыі. У межах сваёй школы мы правялі эксперымент паміж дзвюма групамі дзяцей за перыяд у месяц: адны вучылі словы без нашай праграмы, другія — з ёй. Тыя, хто вывучаў англійскую мову з Eng for kids, запомнілі ў два разы больш слоў, чым без яе. На рэалізацыю праекта сышло каля трох месяцаў. Займаліся ім цалкам удваіх з Лізай. Зараз ён ужо размешчаны на Google Play. У далейшым хацелі б супрацоўнічаць з рознымі школамі краіны», — расказалі распрацоўшчыкі.

**Дзесяць аўтараў найбольш перспектыўных праектаў атрымалі грашовыя сродкі ў памеры да 40 тарыфных ставак на распрацоўку бізнес-планаў для іх далейшага ўдзелу ў штогадовым рэспубліканскім конкурсе інавацыйных праектаў.**

**«Бранзалет клопату»** — так гучыць ініцыятыва **Кацярыны ЯРМАЛЮК і Эльнура АДЗІЛАВА, навучэнцаў Беларускага дзяржаўнага медыцынскага каледжа.** Праект стаў адным з пераможцаў у намінацыі «Грамадства, эканоміка і сацыяльная сфера. «Ён скіраваны на своечасовае аказанне медыцынскай дапамогі тым, хто знаходзіцца ў зоне рызыкі (хто перанёс інсульт, пакутуе на цукровы дыябет, астму, эпілепсію і іншыя захворванні). Бранзалет дапаможа мінакам або медыцынскім работнікам хутка вызначыць, якую першую медыцынскую дапамогу трэба аказаць чалавеку, якому стала дрэнна на вуліцы ці ў грамадскім транспарце. Адсканаваўшы штрых-код на рэчы, можна даведацца пра гісторыю хваробы пацыента, ці маюцца алергічныя рэакцыі, супрацьпаказанні і гэтак далей. На бранзалеце нанесены QR-код, які зможа прачытаць любы, у каго ёсць смартфон. Такім чынам, хворыя будуць абаронены, аб іх стане своечасова даложаць у хуткую дапамогу — гэта паскорыць працэс рэагавання. Счытваючы QR-код, медработнікі будуць мець поўную інфармацыю пра пацыента, адпаведна, будзе большая верагоднасць па яго выратаванні ад смяротнага зыходу. Сілікон, з якога зроблены бранзалет, — экалагічны і гіпаалергенны матэрыял, які не вылучае ў паветра небяспечныя рэчывы».

Мабільную праграму **«Словаход»** прадставіла **Анастасія НЕЎДАШЭНКА, навучэнка Гомельскага дзяржаўнага мастацкага каледжа.** «Праект распрацаваны з мэтай папулярызацыі беларускай мовы сярод дзяцей і моладзі. Навучанне аформлена ў выглядзе мабільнай гульні. Такі від дзейнасці любяць усе, таму яна арыентавана на любы ўзрост. Аналагаў няма ні ў нашай краіне, ні ў краінах СНД. Падобныя праекты арыентаваныя ў першую чаргу на адукацыйную функцыю, мой жа — у тым ліку і на забаўляльную, каб актывізаваць пазнавальную дзейнасць, паказаць, што вывучэнне мовы — гэта вельмі займальна. Часта дзеці ўспрымаюць працэс вывучэння мовы як нешта аднастайнае, я ж хачу даказаць, што гэта нясумная прыгода. Гульня ўлічвае асаблівасці нашага мозга, памяці, увагі, усё зроблена так, каб была задзейнічана даўгачасная памяць. Я займаюся графічным складнікам, праграмны код дапамагалі пісаць спецыялісты, у далейшым для развіцця дадатку неабходна дапамога філолагаў па беларускай мове, аніматараў, кампазітараў. Хацелася б укараніць такую гульню ва ўстановы адукацыі нашай краіны».

Яшчэ адзін пераможца — праект **«Батлейка, беларускі народны лялечны тэатр, інавацыі на аснове адраджэння традыцый. Кантактны тэатр з элементамі эмацыянальнай тэрапіі» Мікалая ШАЎКО і Кацярыны ФЯДЗЬКОВІЧ, вучняў Празароцкага дзіцячага сада-сярэдняй школы імя Ігната Буйніцкага Глыбоцкага раёна.**

— Наша распрацоўка нацэлена на адаптацыю дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі, іх развіццё і інтэграцыю ў грамадстве. Пачалося ўсё з таго, што на базе нашай школы мы, вучні, разам з настаўніцай Святланай Кузняцовай рэалізавалі беларускі лялечны тэатр — батлейку, — кажа Кацярына. — Сцэнай для самаробных лялек служылі спецыяльна зробленыя пераносныя скрынкі, якія сваім вонкавым выглядам нагадвалі хатку з адным ці некалькімі паверхамі. Спектаклі суправаджаліся музыкай і спевамі, сцэна і лялькі асвятляліся свечкамі. Дэталі лялек, дарэчы, выкананы тэхнікай лепкі халодным фарфорам, а для пашыву адзення выкарыстаны льняная і трыкатажная тканіны, футра, сінтэпух і іншае. Усе персанажы «жывыя», з імі можна павітацца, парукацца, паразмаўляць. Я ў пэўны момант стала вывучаць мову жэстаў, каб усе дзеці змаглі цалкам разумець тое, што мы перадаём. Наш тэатр кантактны, для кожнай лялькі ёсць свой пах — дзеці нюхаюць і ў малых з'яўляецца больш цэласны вобраз персанажаў. Сцэнарыі бяром як тыя, што ўжо ёсць, так і ствараем новыя самі.



Аляксандра БАРЫСЕНКА з праектам «Жывое адзенне».

— Лічым, што развіваць такі праект вельмі важна, паколькі моладзі трэба пераказваць і перадаваць такую спадчыну, каб захоўваць традыцыі і гэтую каштоўнасць перадаваць далей, — дадаў Мікалай. — Дзецям вельмі падабаецца, прыходзяць да нас з задавальненнем. Усіх акцёраў у нас 12, лялек 11. Больш за ўсё малым падабаюцца анёл і чарцяня, але ёсць і асаблівыя — для тых, хто не бачыць.

**«Птушыны дом»** — праект пераможцы ў намінацыі «Рацыянальнае прыродакарыстанне і глыбокая перапрацоўка прыродных рэсурсаў» каманды сярэдняй школы вёскі Чарнаўчыцы Брэсцкага раёна на чале з яе **дырэктарам Таццянай СІНЯЎСКАЙ.** Ён прадугледжвае стварэнне актывістамі на тэрыторыі закінутага кар'ера ў вёсцы рэкрэацыйнай зоны пад такой назвай. Мэта каманды — стварыць прыродны парк з вела-пешаходнымі сувязямі і тэматычнымі зонамі, а таксама веластанцыі на базе школы, дзе будзе захоўвацца транспарт.

**«Вельмі важна, што найлепшыя праекты атрымаюць падтрымку, у тым ліку фінансавую, і будуць рэалізаваныя».**

— Падчас добраўпарадкавання гэтай тэрыторыі вырашаецца адразу некалькі задач: ствараецца зона адпачынку для насельніцтва, ліквідуецца забруджванне тэрыторыі смеццем, павялічваецца біялагічная разнастайнасць мясцовых дзікіх птушак і прыцягваецца падрастаючае пакаленне да пытанняў аховы прыроды пры дапамозе стварэння адукацыйнай экасцежкі. Для нас важна сфарміраваць у мясцовых жыхароў экалагічнае мысленне. Чаму выбралі такую назву ініцыятывы? Цяпер на тэрыторыі кар'ера (а гэта пяць гектараў) утварылася своеасаблівае экалагічнае асяроддзе з гнездавання птушак. На жаль, узровень вады ў кар'еры даволі нізкі, таму лебедзі тут больш не жывуць, але мы плануем адрадзіць біялагічную разнастайнасць і павялічыць папуляцыю птушак. А на сцежцы настаўнікі змогуць праводзіць адкрытыя школьныя заняткі па біялогіі і прыродазнаўстве. Зробім яе не толькі навучальнай, але і прыгодніцкай. Участак працягласцю ў 200 метраў разаб'ём на 10 вузлоў, дзе арганізуем квэст, прайшоўшы які, удзельнікі атрымаюць адказы на пытанні ў сферы экалогіі і аховы дзікай прыроды. На гэтым этапе ўсё ўпіраецца ў фінансаванне, таму хочам зацікавіць сваім праектам спонсараў, — падзялілася Таццяна Сіняўская.

Пераможцаў узнагародзілі дыпломамі і статуэткамі. Таксама дзесяць аўтараў найбольш перспектыўных праектаў атрымалі грашовыя сродкі ў памеры да 40 тарыфных ставак на распрацоўку бізнес-планаў для іх далейшага ўдзелу ў штогадовым рэспубліканскім конкурсе інавацыйных праектаў. Нагадаем, арганізатарамі рэспубліканскага конкурсу «100 ідэй для Беларусі» з'яўляюцца БРСМ, Дзяржаўны камітэт па навуцы і тэхналогіях пры падтрымцы Міністэрства адукацыі Беларусі.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**

# ВЯСНА Ў «ЦЁМНА-ЧЫРВОНАЙ» ЗОНЕ

## Чаму пандэмія накрыла Эстонію?



**Урад Эстоніі прыняў рашэнне ўвесці новыя абмежаванні ў сувязі з паскораным распаўсюджваннем каранавіруснай інфекцыі. Пра гэта паведаміла прэм'ер-міністр Кая Калас, перадаў err.ee. «Распаўсюджванне каранавіруса вельмі-вельмі інтэнсіўнае, і каб разарваць інфекцыйны ланцужок, мы вымушаныя ўвесці новыя абмежаванні», — адзначыла кіраўнік урада. Лакдаўн уведзены з 1 сакавіка і будзе захоўвацца як мінімум да канца месяца. Эстонія працягвае знаходзіцца ў «цёмна-чырвонай» зоне, якая лічыцца самай небяспечнай. Адпаведным колерам пазначаюцца краіны Еўрасаюза, дзе 14-дзённы кумулятыўны ўзровень распаўсюджвання захворвання перавышае 500 выпадкаў на 100 тысяч жыхароў. Па гэтым паказчыку краіна заняла другое месца ў Еўропе. Чаму пандэмія накрыла Эстонію, чаго чакаць надалей?**

### БЕЗ ЛАВАК І WI-FI

Прэм'ер-міністр удакладніла, што школы, у якіх навучэнцы з 5 да 12 класа павінны былі заставацца на аддаленым навучанні адзін тыдзень пасля канікул, цяпер застануцца дома да канца сакавіка. На дыстанцыйным навучанні таксама будуць знаходзіцца прафесійныя і вышэйшыя навучальныя ўстановы. Класы з першага па чацвёрты па-ранейшаму будуць вучыцца кантактна, у школах працягнуцца індывідуальныя кансультацыі і заняткі для навучэнцаў з асаблівымі адукацыйнымі патрэбамі.

Па словах міністра адукацыі Лійны Керсны, абмежаванні закрануць 190 тысяч школьнікаў па ўсёй Эстоніі. Пры гэтым дыстанцыйнае навучанне будзе абыходзіцца ў 10 мільёнаў еўра ў тыдзень. Міністр дадала, што ўрад пакуль адназначна не вырашыў, як будзе працягвацца вучоба для навучэнцаў дзявятых і дванаццатых класаў (выпускных класаў асноўнай школы і гімназіі). Па словах Керсны, у пэўнай ступені ў гэтых класах неабходна аднавіць кантактнае навучанне. «Мяне вельмі моцна непакоіць, як падтрымаць вучняў выпускных класаў, каб яны маглі перайсці на наступную адукацыйную ступень», — заўважыла міністр адукацыі.

Акрамя таго, у Эстоніі ўведзена забарона на арганізацыю мерапрыемстваў у памяшканнях, уключаючы кінасеансы, тэатральныя паказы і канцэрты. Публічныя мерапрыемствы і сходы пад адкрытым небам будуць дазволены, калі колькасць іх удзельнікаў не перавышае 10 чалавек у адной групе, а групы не кантактуюць паміж сабой. Публічныя мерапрыемствы нельга будзе праводзіць з 22.00 да 06.00.

Спа, водныя цэнтры і саўны застануцца зачыненыя з захаваннем магчымасці індывідуальных трэніровак у водных цэнтрах.

Прадпрыемствы грамадскага харчавання змогуць абслугоўваць кліентаў на месцы да 18.00 з захаваннем правіла «2 + 2» і патрабавання 50-працэнтнай запаўняльнасці, а пасля гэтага ім будзе дазволена толькі прадаваць ежу навынас або з дастаўкай дадому.

У сферы заняткаў па інтарэсах і спорту ў памяшканнях будуць дазволеныя толькі індывідуальныя трэніроўкі, а пры занятках на вуліцы працягнуць дзейнічаць раней уведзеныя абмежаванні.



Пры гэтым урад вырашыў не ўводзіць асобныя абмежаванні ў гандлёвых цэнтрах, уладальнікі якіх паабяцалі самі прыняць адпаведныя меры па прафілактыцы заражэння каранавірусам. Сярод абмежаванняў — адключэнне Wi-Fi на тэрыторыі гандлёвых цэнтраў, наём дадатковых ахоўнікаў для праверкі выканання патрабавання па нашэнні масак, забарона на дэгустацыі. Мерапрыемствы прадугледжваюць падтрыманне строгага масачнага рэжыму, таксама прадпісана прыбраць усе лаўкі і іншыя ўладкаваныя месцы, дзе можна прысесці.

### ХВАРОБА ПАЎСЮЛЬ

Як вядома, рэжым надзвычайнага здарэння дзейнічаў у краіне ў сувязі з пандэміяй з 13 сакавіка да 17 мая мінулага года. Урад Эстоніі ўвёў з 28 снежня да 17 студзеня маштабныя абмежаванні з-за распаўсюджвання каранавіруса ў павеце Хар'юмаа, у тым ліку ў сталіцы, пазней іх працягнулі да 31 студзеня. У лютым лакдаўн распаўсюдзілі на ўсе паветы краіны. А з пачаткам вясны патрабаванні сталі больш жорсткія.

«Пры ўвядзенні абмежаванняў мы ацэньвалі ўплыў кожнага з іх на эканоміку і людзей. З пачатку каранакрызіса беспрацоўе ў Эстоніі паднялося да 8,8 працэнта, а ў Іда-Віру — нават да 14,6 %. Праблемы душэўнага здароўя цяжэй змераць, але мы ўсе адчуваем стомленасць ад крызісу», — адзначыла прэм'ер-міністр Кая Калас у Рыйгікогу (эстонскім парламенце), дзе расказала аб сітуацыі з каранавірусам. Выступленне кіраўніка ўрада транслявалася ў прамым эфіры на тэлеканале ETV+.

Калас паведаміла парламентарыям, што, паводле даных «каронадэтэктываў» Дэпартамента здароўя, у апошні месяц людзі заражаліся ў асноўным у сямейным коле — 32 працэнты і на рабоце — 14 %. Выклікае неспакой тое, што ў траціне выпадкаў немагчыма вызначыць, дзе адбылося заражэнне. «Гэта сведчыць аб тым, што ў Эстоніі назіраецца эпідэмічнае распаўсюджванне віруса, і заразіцца можна дзе заўгодна, дзе не выконваецца дыстанцыя, напрыклад, у гандлёвых цэнтрах, грамадскім транспарце і гэтак далей», — падкрэсліла кіраўнік урада.

### НА МЯЖЫ МАГЧЫМАСЦЯЎ

Міністр здароўя і працы Танель Кійк заўважыў, што днямі споўніўся роўна год з таго часу, калі ў Эстоніі зафіксавалі першы выпадак COVID-19. «Гэта быў цяжкі год са сваімі ўздымамі і спадамі», — адзначыў ён. Па словах Танеля Кійка, сітуацыя з каранавірусам на сённяшні дзень крытычная. «Колькасць пацыентаў, якія маюць патрэбу ў стацыянарным лячэнні, у найбліжэйшы час абавязкова вырасце, што непазбежна прывядзе да рэарганізацыі работы шпіталяў. Урэгуляванне каранакрызісу патрабуе абмежавання іншых паслуг аховы здароўя. Нашай мэтай было і застаецца захаванне як планавага лячэння, так і якаснага лячэння хворых на COVID-19, але магчымасці медыцынскай сістэмы не бязмежныя. Больш проста не засталося свабоднага рэсурсу. Калі мы хочам, каб планавае лячэнне аднавілася як мага хутчэй, мы павінны прыкласці сур'ёзныя намаганні. Мы ўжо бачылі, як хутка могуць расці паказчыкі», — заўважыў Кійк.

Па словах міністра, уведзеныя ўрадам абмежаванні безумоўна суб'ектыўныя, і ў іх хапае несправядлівасці, але яны ўведзены для зніжэння перамяшчэння, паколькі на станоўчы вынік працуе любое яго абмежаванне.

### ВАКЦЫНА НА НУЛІ

Паводле даных агляду захваральнасці на каранавірус у краінах ЕС, падрыхтаванага Helsingin Sanomate, паказчык Эстоніі ўжо 11 лютага быў найвышэйшы сярод краін Балтыі. Колькасць новых выпадкаў заражэння ў краіне апошнім часам павялічылася вельмі значна. «На сёмым тыдні колькасць новых выпадкаў заражэння вырасла ў краіне на 22 працэнты. Па гэтым паказчыку мы знаходзімся на другім месцы ў Еўропе. Пры захаванні такіх тэмпаў выйсці ў лідары нескладана», — прыводзіць err.ee словы гендырэктара Дэпартамента здароўя Юлара Лана.

Тэндэнцыя хуткага росту захваральнасці захоўваецца ў Хар'юмаа, у павеце з самай вялікай колькасцю насельніцтва. Хваляванні чыноўнікаў выклікае сітуацыя ў Іда-Віру і Ляэнэ-Віру, а таксама на Саарэмаа, у Вырумаа і Пылвамаа. Узровень захваральнасці стабілізуецца ў Пярнускім і Тартускім паветах, а таксама ў некаторых раёнах Гіію, Рапля і Ігева. Аднак стабілізацыя сама па сабе вельмі падманлівая, асабліва ў вялікіх паветах, паколькі, спыніўшыся ў нейкі момант, захваральнасць пасля зноў працягвае расці, лічаць спецыялісты.

«Сумна тое, што доля пазітыўных вынікаў перавышае 18 працэнтаў усіх тэстаў. Гэта значыць, што кожны пяты можа быць носьбітам віруса», — адзначыў Лана. Ён заўважыў, што на Саарэмаа ўжо 1500 выпадкаў каранавіруса на 100 тысяч насельніцтва. Сітуацыя «вымушае задумацца аб тым, няўжо мы нічому не навучыліся за гэты год», падкрэсліў эксперт.

«Сёння больш няма сэнсу хаваць галаву ў пясок. Усе мы стаміліся, але ўсе мы павінны ўсведамляць сваю адказнасць. Зараз, калі колькасць заражэнняў бесперапынна расце, у нас больш няма рэзерву, каб працягваць па-ранейшаму. Мы можам самі рабіць прыкладна 90 % неабходнага для зніжэння захваральнасці», — сказаў ён.

«Калі зірнуць на ўмовы працы, то дыстанцыйная работа рэкамендуецца. Дэпартамент здароўя ўжо працуе аддалена. Заклікаю да гэтага ўсіх. Трэба адмовіцца ад любых кантактаў, якія цяпер можна скараціць. У нас больш не засталося рэзерваў для больш свабодных схем», — сказаў Лана.

Паводле яго слоў, сітуацыя «звышкрытычная», паколькі вакцыны ў дэпартамента здароўя амаль скончыліся. Няма сэнсу ствараць ураджанне, што вакцыны дзесьці затрымаліся. У дэпартамента здароўя іх няма, бо на складзе яны на нулі». Так, вакцыны AstraZeneca не засталося зусім, Pfizer засталося каля аднаго працэнта, і яшчэ некалькі тысяч доз Moderna. Насельніцтва Эстоніі складае 1,3 мільёна чалавек. Пры гэтым вакцынавана хоць бы адной дозай крыху больш за 100 тысяч жыхароў. Таксама Лана асцерагаецца, што ў краіне можа не хапіць ложкавага фонду. «Усё бліжэй момант, калі планавае лячэнне стане мінімальным або спыніцца», — папярэдзіў ён.




### ГОРШ НЕ ПРЫДУМАЕШ

Кіраўнік Ляэнэ-Талінскай цэнтральнай бальніцы Аркадзь Папоў растлумачыў postimees.ee, што сітуацыя — горш не прыдумаеш. Кожны дзень кіраўнікі ўсіх бальніц маюць зносіны адзін з адным, і цяпер пацыенты ўжо пераразмяркоўваюцца паміж бальніцамі так, каб нагрузка была аднолькавая і бальніцы маглі прымаць і іншых пацыентаў. «Я спадзяюся, што ўведзеныя ўрадам абмежаванні спрацуюць і прымусяць людзей зразумець, што праблема вельмі сур'ёзная і што абмежаванні дзейнічаюць не проста для «птушкі», — сказаў ён. Акрамя таго, ён згадаў, што і іншыя эстонскія бальніцы таксама плануюць яшчэ больш зменшыць планавае лячэнне.

Па словах доктара Папова, раней была надзея, што Эстонія не дасягне еўрапейскага максімуму па ўсіх паказчыках каранавіруса менавіта таму, што там нізкая шчыльнасць насельніцтва, але, на жаль, не склалася. «Цяпер адзіны выхад з сітуацыі ў тым, каб людзі выконвалі абмежаванні», — падкрэсліў эксперт.

Нягледзячы на пазітыўныя прагнозы Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, казаць аб хуткім спадзе захваральнасці на COVID-19 яшчэ вельмі рана. Такое меркаванне tvr.by выказаў кіраўнік Ляэнэ-Талінскай цэнтральнай бальніцы. Па словах эксперта, моцныя апасенні выклікаюць новыя штамы каранавіруса, асабліва — паўднёваафрыканскі варыянт. Ён «таксама ўжо трапіў у Еўропу, але пакуль не моцна распаўсюджаны. Ён больш кантагіёзны, чым іншыя штамы, самае галоўнае яго адрозненне якраз у тым, што Astrazeneca неэфектыўная супраць гэтага штама з вялікай верагоднасцю. І тая структура злучальнага бялку, якая на паверхні гэтага віруса, хутчэй за ўсё, адрозніваецца дастаткова значна ад злучальнага бялку іншых штамаў каранавіруса. Паводле неапублікаваных даследаванняў, якія прасачыліся ў выданні, мы можам меркаваць аб тым, што Astrazeneca засцерагае толькі на ўзроўні 10 ці крыху больш працэнтаў ад паўднёваафрыканскага віруса, што ў рэшце рэшт складае праблему».

Каментуючы апошнія лічбы аб колькасці станоўчых тэстаў на каранавірус, Аркадзь Папоў заўважыў: «Сёння ўсё дрэнна, а можа быць кашмар, калі шпіталі будуць перагружаныя».

**Пётр ДУНЬКО.**

ОБЪЯВЛЕНИЕ

# ОАО «Минскоблхлебопродукт»

**ИЗВЕЩАЕТ, ЧТО ОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ СОСТОИТСЯ 30 марта 2021 года по адресу: г. Минск, ул. Фабрициуса, 2**

Начало собрания в 14.00.
Регистрация акционеров с 13.30 до 13.55.
При себе иметь документы: акционеру общества – паспорт, представителю акционера паспорт и доверенность.

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2020 год и основных направлениях деятельности на 2021 год.
2. О рассмотрении отчета наблюдательного совета Общества за 2020 год.
3. О результатах аудиторской проверки и проверки ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2020 год.
4. Об утверждении годового отчета, годовой бухгалтерской (финансовой) отчётности о деятельности Общества за 2020 год.
5. О распределении прибыли Общества за 2020 год и выплате дивидендов за 2020 год.
6. О направлениях использования прибыли на 2021 год и первый квартал 2022 года. Периодичность выплаты дивидендов в 2021 году.
7. Об избрании членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.
8. Об утверждении размеров вознаграждений членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.

УНП 600013173

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ (ПОВТОРНЫХ) ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона, оператор ЭТП** | **ООО «Расантехторг», г. Минск, ул. Беды, 33, помещение 339. Адрес ЭТП: info@torgi24.by** |
| **Продавец** | **Узденское районное потребительское общество, 223411, Минская область, г. Узда, пер. К. Маркса, 7** |

**Предмет электронных торгов**

| Лот | Наименование (назначение), инвентарный номер | Начальная цена | Сумма задатка |
|---|---|---|---|
| **717** | Здание магазина, и/н 623/С-58658 | 57290,00 | 5729,0 |
| **718** | Магазин, и/н 623/С-58261 | 3500,00 | 350,0 |
| **719** | Магазин, и/н 623/С-58691 | 24800,00 | 2480,0 |
| **720** | Магазин, и/н 623/С-58930 | 27000,00 | 2700,0 |
| **721** | Здание магазина, и/н 623/С-58468 | 8100,00 | 810,0 |
| **722** | Магазин, и/н 623/С-59097 | 29600,00 | 2960,0 |
| **723** | Здание магазина, и/н 623/С-58709 | 5200,00 | 520,0 |
| **724** | Здание склада с навесом, и/н 620/С-38757 | 28300,00 | 2830,0 |
| **725** | Здание торгового павильона, и/н 623/С-59643 | 19800,00 | 1980,0 |
| **726** | Здание магазина, и/н 623/С-58748 | 6900,00 | 690,0 |
| **727** | Здание магазина, и/н 623/С-58747 | 5870,00 | 587,0 |
| **728** | Здание магазина, и/н 623/С-57761 | 5100,00 | 510,0 |
| **729** | Здание магазина-кафе «Светлана», и/н 623/С-58796 | 79100,00 | 7910,0 |
| **730** | Здание магазина, и/н 623/С-59022 | 7962,00 | 796,2 |
| **731** | Здание магазина, и/н 623/С-58402 | 10600,00 | 1060,0 |

**Расположенные по адресу: Минская обл., Узденский р-н**

**Размер шага** составляет **5 %** от начальной цены лота

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях (**для каждого лота**) перечисляется на р/с (IBAN): BY56UNBS30120893600010000933 в ЗАО «БСБ Банк», код. (BIC): UNBSBY2X, г. Минск, пр-т Победителей, 23/3, УНП 191514793, получатель: ООО «Расантехторг»

**Срок подписания договора купли-продажи: 5** (пять) рабочих дней после электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Победитель торгов (претендент на покупку) обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее 30 (тридцати) дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов

**Электронные торги проводятся в порядке, установленном регламентом электронной торговой площадки ООО «Расантехторг», размещенным по адресу: www.torgi24.by**

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан возместить затраты на проведение торгов и оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере **5 %** от цены продажи лота в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона. Затраты на организацию и проведение электронных торгов составили: по лоту (для каждого лота) – не более **650,00 бел. руб.**

**Дата и время начала торгов: 07.04.2021** в 09.00.
**Дата и время окончания торгов: 07.04.2021** в 16.00.
Торги продлеваются на 3 минуты с момента подачи ставки в случае если ставка поступила менее чем за 3 минуты до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок: 03.04.2021 до 17.00** на ЭТП ООО «**Расантехторг**» по электронному адресу: **www.torgi24.by**.

**Контактные данные: +375 (29) 607-79-50; +375 (29) 607-22-87. E-mail: linfo@torgi24.by.**

**Антикризисный управляющий общества с ограниченной ответственностью «Аксофтбел» – ООО «Форхэнд» (организатор торгов) извещает о проведении 01.04.2021 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Тростенецкая, 5, пом. 221 открытых торгов по продаже дебиторской задолженности общества с ограниченной ответственностью «Аксофтбел»:**

ООО «Алленди Трейд» (размер задолженности – 472,27 BYN) – первоначальная цена – 472,27 BYN; ООО «Центр системных интеграций» (размер задолженности – 5 556,07 BYN) – первоначальная цена – 5 556,07 BYN; ООО «Программные кассы» (размер задолженности – 416 440,67 BYN) – первоначальная цена – 416 440,67 BYN; Niltasoft Limited (Кипр) (размер задолженности – 994,90 USD) – первоначальная цена – 994,90 USD.

Шаг аукциона – 5 % от цены лота. Задаток для участия в аукционе – 5 % от цены лота. Прием заявлений на участие в торгах осуществляется по почтовому адресу: 220123, г. Минск, а/я 69, с даты настоящей публикации по 31.03.2021 г. Оплата задатка производится с даты настоящей публикации по 31.03.2021 г. вкл. на р/с общества с ограниченной ответственностью «Аксофтбел» р/с BY33 MMBN 3012 0186 2001 0933 0000 в ОАО «Банк Дабрабыт», BIC MMBNBY22, УНП 190675852.

Победителем признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену. Заключение договора купли-продажи осуществляется в течение 10 дней со дня проведения торгов. Победитель торгов в течение 5 рабочих дней со дня заключения договора купли-продажи оплачивает цену за минусом внесенного задатка. Участникам, не признанным победителями, задаток возвращается в безналичной форме в течение 5 банковских дней с момента утверждения протокола об итогах торгов. Уведомление участников об итогах торгов в день торгов, публично. Возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги. Участие в торгах и результаты торгов оформляются итоговым протоколом в день их проведения. В случае признания торгов несостоявшимися в связи с подачей заявления на участие в них только одним участником, предмет торгов может быть реализован этому участнику по начальной цене, увеличенной на 5 процентов. Организатор может отказаться от проведения торгов не позднее, чем за один день до их проведения.

Центр Промышленной Оценки

- **ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ**
- **ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. Сайт в интернете: www.cpo.by** |
| **Продавец** | **ОАО «Бобруйсксельмаш», Могилевская область, г. Бобруйск, ул. Орловского, 20, 213823** |
| **Оператор ЭТП** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б. www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов – недвижимое имущество, реализуемое одним лотом, в следующем составе**

**Здание проходной** (здание административно-хозяйственное) общей площадью **101,2 кв. м,** инв. номер 710/С-41816. Составные части и принадлежности: крыльца (3 шт.). Адрес: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Орловского, 25А. **Обременение:** аренда. Более подробная информация на сайте www.ipmtorgi.by

**Склад 78-79-4700** (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ) общей площадью **209,5 кв. м,** инв. номер 710/С-69979. Адрес: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Орловского, 25А/2

**Сведения о земельном участке**: предоставлен общей площадью 0,1078 га на праве аренды по 16.07.2070 г. для обслуживания здания проходной и склада.

| | |
|---|---|
| **Начальная цена с НДС 20 %** | **66 453,35 белорусского рубля** |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях (BYN) перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – **ЗАО «Центр промышленной оценки»**

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **15** рабочих дней после электронных торгов |

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет электронных торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

**Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение 5 % от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» 19.01.2021 г.

**Дата и время начала и окончания электронных торгов**
Начало торгов **10.00 24.03.2021 г.**
Окончание торгов **12.00 24.03.2021 г.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:** заявки на участие в электронных торгах принимаются по 22.03.2021 г. до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by

**Контактные телефоны: +375 17-280-36-37; +375 (29) 317-95-42; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by; info@ipmtorgi.by**

## О реализации имущества ООО «Косинские экопродукты» (УНП 690857017)

Торги по реализации имущества ООО «Косинские экопродукты», назначенные на 05.02.2021, признаны несостоявшимися

| | |
|---|---|
| **Организатор торгов** | Антикризисный управляющий ООО «ЛиквидБай» |
| **Форма, дата, время и место проведения торгов** | Повторные торги в форме открытого аукциона **18.03.2021 в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Скрыганова, 6, оф. 700 |

**Сведения о предмете проведения торгов**

Лот № 1: запайщик лотков вакуумный Henkovak tps compact xl полуавтоматический.
По вопросу ознакомления с предметом торгов, дополнительной информацией по предмету торгов обращаться по тел.: 8044 7945248, 8017 2040494, 8044 7303843

| | |
|---|---|
| **Начальная цена предмета торгов (без НДС)** | Лот № 1: – **12 891,50** руб. |

**Порядок проведения торгов**

Шаг аукциона – 5 %. Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену. Участникам, не признанным победителями, задаток возвращается в безналичной форме в течение 3 банковских дней с момента утверждения протокола об итогах торгов. Результаты торгов оглашаются публично в день проведения торгов. В случае признания торгов несостоявшимися в связи с подачей заявки на участие в них только одним участником, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %

**Размер задатка, сроки приема заявок и порядок зачисления задатка**

Задаток в сумме 10 % от стоимости предмета торгов перечисляется по выбранному лоту в срок по 17.03.2021 на р/с BY17PJCB3012 00513 1610 0000 0933 в ОАО «Приорбанк», БИК PJCBBY2X, г. Минск, получатель – ООО «Косинские экопродукты», УНП 690857017, назначение платежа – задаток за участие в аукционе. Задаток должен быть внесен до подачи заявки на участие в торгах. Прием заявок с приложением документов осуществляется заказной корреспонденцией в адрес ООО «ЛиквидБай» (220079, г. Минск, а/ящик 256) либо по e-mail: maruk-73@mail.ru до 17.00 17.03.2021. Сроком поступления заявки является дата регистрации в журнале регистрации

**Возмещение затрат**

Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, в течение 5 дней со дня проведения

| | |
|---|---|
| **Документы, необходимые для участия в торгах** | Заявка на участие в торгах, платежный документ о перечислении задатка; документ, подтверждающий полномочия на участие в торгах |
| **Ранее опубликованные извещения** | Ж-л «Судебный вестник Плюс: экономическое правосудие». – 2020 – № 9. – С. 69; № 11. – С. 62 – 63, газета «Звязда» – 20.01.2021. – № 10 (29379). – С. 15; www.bankrot.gov.by |

## ИНФОРМАЦИЯ О РЕОРГАНИЗАЦИИ ЭМИТЕНТА

В соответствии с решением Общего собрания участников 01.03.2021 Общество с ограниченной ответственностью «БЕЛХАНТЕР» (юридический адрес: 220045, г. Минск, пр. Дзержинского, 127, пом. 489; УНП 191667503) было реорганизовано в форме выделения из него общества с ограниченной ответственностью «МОД ХАУС ДЕВЕЛОПМЕНТ» (юридический адрес: 220045, г. Минск, пр. Дзержинского, д. 127, помещение 488; УНП 193514757).

УНП 191667503

# Каляндар стрыжак на сакавік



***2 сакавіка, аўторак.*** Разам са стрыжкай валасоў можна справакаваць новыя хваробы, страціць актыўнасць у справах, таму стрыжку варта адкласці да больш спрыяльнага часу.

***3 сакавіка, серада.*** Нейтральны дзень для стрыжкі. Прамыя валасы найлепшым чынам дапамогуць прыцягнуць станоўчыя энергетычныя патокі.

***4 сакавіка, чацвер.*** Нейтральны дзень для стрыжкі валасоў. Хочаце сур'ёзных змен у жыцці, зрабіце бунтарскую стрыжку, стварыўшы эфект нядбайнасці.

***5 сакавіка, пятніца.*** Новая стрыжка станоўча паўплывае на ўзаемаадносіны з дамачадцамі і каханым чалавекам.

***6 сакавіка, субота.*** Парады астролагаў неадназначныя: альбо стрыжомся і кардынальна фарбуемся, альбо нічога не робім на галаве.

***7 сакавіка, нядзеля.*** Спрыяльны дзень для модных сіметрычных стрыжак. Паход у цырульню дапаможа пазбавіцца ад матэрыяльных праблем.

***8 сакавіка, панядзелак.*** Добры дзень для новай прычоскі, але варта ўлічыць, што пасля стрыжкі валасы растуць павольней, чым звычайна, паколькі Месяц зараз меншае.

***9 сакавіка, аўторак.*** Выдатны этап для ўсяго новага і неардынарнага, можна не толькі падстрыгчыся, але і змяніць адценне, смела эксперыментуйце.

***10 сакавіка, серада.*** Сёння стрыжка ўзмоцніць вастрыню інтуіцыі, што дапаможа дасягнуць пастаўленых мэт. Для атрымання энергіі сёння неабходна зрабіць лёгкую прычоску, якая кучаравіцца.

***11 сакавіка, чацвер.*** Сёння лепш пакінуць валасы ў спакоі. Стрыжку перанясіце на больш удалы дзень.

***12 сакавіка, пятніца.*** Неспрыяльны месяцавы ўплыў на валасы. Стрыжка, зробленая ў гэты час, будзе няўдачнай, можа ўтварыцца перхаць.

***13 сакавіка, субота.*** Дзень для стрыжкі валасоў неспрыяльны. Пакараціўшы даўжыню, вы толькі прынесяце сабе масу нязручнасцяў, валасы стануць непаслухмяныя, а працэдура ўкладкі зойме масу часу безвынікова.

***14 сакавіка, нядзеля.*** Не самы ўдалы дзень для стрыжкі: валасы будуць адрастаць даволі павольна, а прычоска можа вас зусім не задаволіць.

***15 сакавіка, панядзелак.*** Любыя маніпуляцыі з даўжынёй і колерам валасоў рэкамендуецца перанесці на больш удалы дзень. Інакш валасы могуць стаць непаслухмянымі, пачаць выпадаць больш за норму.

***16 сакавіка, аўторак.*** Выдатны дзень для наведвання салона прыгажосці. Стрыжка надасць сіл і здароўя валасам: яны стануць гусцейшыя і мацнейшыя, выпадзенне значна зменшыцца.

***17 сакавіка, серада.*** Стрыжка дадасць пачуццёвасці і прывабнасці, не трацце дарма часу, усё ў вашых руках, прыхільнікі толькі і чакаюць гэтага моманту.

***18 сакавіка, чацвер.*** Стрыжка не толькі паскорыць рост валасоў, але і абвострыць інтуіцыю — месяцавая энергія будзе паступаць з падвоенай сілай.

***19 сакавіка, пятніца.*** Для таго каб праявіць свае інтуітыўныя здольнасці, варта трохі падраўняць канцы валасоў. Радыкальная стрыжка сёння не вітаецца.

***20 сакавіка, субота.*** Выдатны дзень для новай стрыжкі. У гэты дзень разам з састрыжанымі валасамі вы зможаце ачысціць сябе ад негатыву. Валасы становяцца моцныя і здаровыя.

***21 сакавіка, нядзеля.*** Вельмі неспрыяльны час для стрыжкі. Новая прычоска можа быць няўдалай, прывядзе да мігрэні, дрэннага настрою і агульнага пагаршэння здароўя.

***22 сакавіка, панядзелак.*** Магчымыя таніраванне, меліраванне і іншыя эксперыменты з колерам. Сур'ёзныя перамены ў прычосцы не вітаюцца.

***23 сакавіка, аўторак.*** Стрыжку адкладзіце да лепшых часоў, каб не страціць грошы, не сапсаваць сабе настрой і не пасварыцца з блізкімі.

***24 сакавіка, серада.*** Стрыгчыся можна і трэба, вы атрымаеце дзіўны вынік, а вось мяняць колер пакуль не абавязкова.

***25 сакавіка, чацвер.*** Падстрыгшыся, можна атрымаюць кучаравыя валасы, калі яны былі прамыя, і аб'ёмную прычоску, калі яна не вызначалася пышнасцю. Вы гатовыя? Тады — наперад.

***26 сакавіка, пятніца.*** Унікальны час для таго, каб удала падстрыгчыся. Люстэрка здзівіць вас атрыманым вынікам.

***27 сакавіка, субота.*** Добры дзень для наведвання салона прыгажосці. Новая прычоска будзе ўдалая і дапаможа здабыць аптымістычны настрой, дадасць упэўненасці ў сабе.

***28 сакавіка, нядзеля.*** Сёння — поўня, а, значыць, не рызыкуем, валасамі не займаемся, а толькі адпачываем! Пагадзіцеся, нават гучыць гэта прывабна!

***29 сакавіка, панядзелак.*** Дзень спрыяльны для любых змен у прычосцы. Мяняйце колер, даўжыню, рабіце новую стрыжку. З пераменамі вы скінеце з сябе негатыў, няўдачы застануцца ў мінулым.

***30 сакавіка, аўторак.*** Стрыжка прывядзе, з аднаго боку, да запаволення росту валасоў, а з другога — да ўмацавання каранёў. Паспрабуйце ў гэты дзень як мага часцей расчэсваць валасы.

***31 сакавіка, серада.*** Сёння цалкам прыдатны дзень для стрыжкі і для афарбоўвання, праўда, пры ўмове, што вы не збіраецеся нічога мяняць, а проста хочаце абнавіць форму і падфарбаваць карані.

Жанчына на вайне

# ГРУЗ ПА ПРЫЗНАЧЭННІ ДАСТАЎЛЕНЫ НЕ БУДЗЕ...

**Калі працаваў у Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь з узнагароднымі дакументамі Беларускага штаба партызанскага руху, маю ўвагу прыцягнула характарыстыка партызанкі Куляшовай-Гразновай Людмілы Мікалаеўны, напісаная камандзірам брыгады «Наперад» Пятром Малюгіным 20 кастрычніка 1943 года. Аднайменны атрад, а затым брыгада, дзейнічаў у Чачэрскім, Кармянскім, Хоцімскім, Касцюковіцкім і Клятнянскім (Бранская вобласць) раёнах.**



ПРЫВОДЗІМ тэкст характарыстыкі цалкам: «З 1 жніўня 1942 да 20 кастрычніка 1943 года была ў саставе маёй брыгады на пасадзе разведчыцы. Самаахвярна адданая Радзіме, палітычна вытрыманая, устойлівы камуніст, чалавек высокай маральнасці, спагадлівы і чулы таварыш, смелая і адважная ў баі тав. Куляшова-Гразнова ўвасабляла сабой высокі ўзор партызанскага мсціўца.

**У невыносных умовах мужная партызанка сваімі паводзінамі, вытрымкай прымушала байцоў не страчваць надзеі на канчатковы поспех, надавала ім сілы для барацьбы з ворагам, які насядаў.**

Нягледзячы на цяжкія ўмовы блакады і праследу карнікаў, Куляшова-Гразнова з выключнай бадзёрасцю і мужнасцю пераносіла ўсе нягоды, падтрымлівала і аказвала дапамогу таварышам. Смелая і адважная ў разведцы, Куляшова 2 лютага 1943 года ў баі з карнікамі пры прарыве блакады ў Клятнянскім лесе, вырваўшыся наперад, паказала прыклад іншым».

Хто яна, адкуль прыйшла ў атрад? На жаль, у картатэцы архіва па ўліку асабовага складу партызанскіх фарміраванняў, а таксама ў дакументах брыгады «Наперад» маюцца скупыя звесткі як пра дзейнасць самой брыгады, так і пра яе асабовы склад. Справа ў тым, што падчас варожых блакад, асабліва ўзімку 1943 года, брыгада панесла вялікія людскія страты. Былі згубленыя і штабныя дакументы.

Па захаваных дакументах атрымалася ўстанавіць, што Куляшова-Гразнова Людміла Мікалаеўна нарадзілася ў 1902 годзе (па адных даных у пасёлку Хоцімск, па іншых — у Магілёве), атрымала сярэднюю адукацыю. Да вайны працавала ў Магілёўскім аблвыканкаме загадчыцай сакрэтнай часткі. 26 чэрвеня 1941 года са спецдакументамі адпраўлена ў савецкі тыл. З 8 ліпеня працавала загадчыцай пратакольнага аддзела Тамбоўскага аблвыканкама, хадзіла на курсы медсёстраў, а затым вечарамі даглядала параненых у эвакашпіталі.

У канцы сакавіка 1942 года Людміла даведалася, што ў Тамбове знаходзіцца прадстаўнік ЦК КП(б)Б па пытанні падбору кандыдатур для адпраўкі ў тыл праціўніка з мэтай дыверсійнай і разведвальнай дзейнасці. Яна пабывала ў яго на прыёме і была ўключана ў спісы такіх прэтэндэнтаў.

8 красавіка 1942 года Людміла прыбыла ў Маскву ў распараджэнне ЦК КП(б)Б і была накіравана ў школу падрыхтоўкі партызанскіх кадраў, дзе за кароткі час атрымала асноўныя навыкі дыверсанткі і разведчыцы.

У ноч з 31 ліпеня на 1 жніўня 1942 года самалётам «Дуглас» Куляшова-Гразнова (чамусьці адна) была дастаўлена ў Чачэрскі раён Гомельскай вобласці і выкінута разам з двума грузавымі парашутамі каля вёскі Асінаўка.

Вось як яна апісвае свой стан перад скачком у справаздачы аб выкананні спецзадання: «У парашутным спорце я нічога не ведала, ніколі на самалёце не лётала, не трэніравалася скакаць. Я не ўяўляла, як сябе буду адчуваць, якое будзе маё самаваладанне падчас скачка. Мяне турбавала думка: скокнуць і прызямліцца, а астатняе — усё дадасца. Падчас палёту інструктар, які суправаджаў мяне, вучыў, як скокнуць, як трымаць ногі пры прызямленні, як зняць парашут».

**«У парашутным спорце я нічога не ведала, ніколі на самалёце не лётала, не трэніравалася скакаць. Я не ўяўляла, як сябе буду адчуваць, якое будзе маё самаваладанне падчас скачка. Мяне турбавала думка: скокнуць і прызямліцца, а астатняе — усё дадасца».**

Прызямлілася Куляшова апоўначы ў зададзеным раёне, на жытнім полі каля лесу. Згодна з указаннем, якое атрымала ў Маскве, яна павінна была схаваць скінуты груз (сілкаванне для рацыі, шыфр для радыста, грошы, прадукты харчавання) і выйсці на сувязь з камандаваннем Чачэрскага партызанскага атрада, праз іх перадаць груз разведгрупе, якая з мая 1942 года дзейнічала каля Гомеля.

АДНАК, як гэта часта бывала, Куляшову-Гразнову сустрэлі партызаны атрада «Наперад» і прапанавалі перадаць груз у іхні атрад, спаслаўшыся на адсутнасць у іх звестак пра месцазнаходжанне Чачэрскага атрада. Праз восем дзён, пераканаўшыся ў тым, што груз па прызначэнні не будзе дастаўлены, яна перадала яго атраду «Наперад», і такім чынам сама стала партызанкай гэтага атрада. Хадзіла ў разведку, адначасова пякла хлеб, чысціла бульбу, мыла бялізну, даглядала параненых. Сярод жанчын-партызанак Куляшова была самай старэйшай па ўзросце. Сваёй адвагай, пераканаўчасцю, смеласцю і настойлівасцю ў вырашэнні канфліктных сітуацый паміж камандным саставам і партызанамі яна набыла павагу сярод баявых таварышаў.

Неўзабаве пачалася нямецкая блакада, і брыгада вымушана была прабівацца ў Хоцімскі раён Магілёўскай вобласці. На новым месцы дыслакацыі Людміла Мікалаеўна часта выконвала складаныя заданні камандавання па разведцы месцаў размяшчэння варожых войскаў, руху эшалонаў, пранікала ў гарнізоны праціўніка, выяўляла здраднікаў і рыхтавала мясцовых жыхароў для ўступлення ў партызаны.

Узімку 1943 года пачалася новая карная экспедыцыя па блакаванні партызан у Хоцімскім і Клятнянскім раёнах, пачаліся новыя баі, новыя выпрабаванні пры выхадзе з акружэння. У справаздачы аб сваёй партызанскай дзейнасці, якая захавалася, Куляшова-Гразнова падрабязна апісвае ўсе цяжкасці гэтага перыяду, называе адважных байцоў і камандзіраў, адзначае факты маральнага разлажэння асобных камандзіраў, што паўплывалі на баяздольнасць брыгады пры прарыве блакады.

Прарывацца з акружэння прыйшлося асобнымі групамі. Людміла Куляшова знаходзілася ў складзе групы на чале з П. Малюгіным, тады яшчэ камісарам брыгады. Днём і ноччу партызаны блукалі па Клятнянскіх лясах, абмарожаныя, галодныя, сілкаваліся толькі снегам. У невыносных умовах мужная партызанка сваімі паводзінамі, вытрымкай прымушала байцоў не страчваць надзеі на канчатковы поспех, надавала ім сілы для барацьбы з ворагам, які насядаў.

**Самалётам «Дуглас» Куляшова-Гразнова (чамусьці адна) была дастаўлена ў Чачэрскі раён Гомельскай вобласці і выкінута разам з двума грузавымі парашутамі каля вёскі Асінаўка.**

У пачатку лютага 1943 года партызанам удалося з боем разарваць кальцо акружэння. Як адзначана ў вышэйназванай баявой характарыстыцы: «Куляшова-Гразнова была сярод першых байцоў, якія кінуліся на праціўніка, агнём з аўтамата прабіваючы шлях да выхаду з блакады».

Разрозненыя групы брыгады прабіраліся назад на Магілёўшчыну, дзе папоўнілі асабовы склад за кошт мясцовага насельніцтва, і ўжо да мая брыгада пачала актыўную баявую дзейнасць.

ЛЮДМІЛА ў гэты перыяд выконвала заданні па разведцы не толькі камандавання брыгады, але і камандзіраў часцей Чырвонай Арміі. Саракагадовая жанчына пад выглядам жабрачкі пранікала ў прыфрантавую зону, збірала неабходныя звесткі аб размяшчэнні варожых войскаў, іх колькасці, узбраенні і да т. п. Напярэдадні наступлення Чырвонай Арміі восенню 1943 года яна ў якасці разведчыцы пабывала ў Прапойскім, Чавускім, Дрыбінскім, Горацкім раёнах і пад Магілёвам.

**Нягледзячы на цяжкія ўмовы блакады і праследу карнікаў, Куляшова-Гразнова з выключнай бадзёрасцю і мужнасцю пераносіла ўсе нягоды, падтрымлівала і аказвала дапамогу таварышам.**

У канцы справаздачы на імя сакратара ЦК КП(б)Б П. К. Панамарэнкі ў снежні 1943 года Куляшова-Гразнова пісала: «Таварыш сакратар ЦК, я не зусім дакладна выканала заданне Разведупра, не даставіла маёй групе груз, але я захавала яго, не дапусціла, каб груз узяў праклятый фашыст. Груз дастаўся слаўным партызанам». На справаздачы рэзалюцыя Панамарэнкі: «Накіравалі адну. Тав. Куляшову трэба ўзнагародзіць».

Згодна з узнагароднымі дакументамі архіва, Куляшова-Гразнова ўзнагароджана медалём «Партызану Айчыннай вайны І ступені» і ордэнам Айчыннай вайны І ступені. Прычым варта адзначыць, што медалём «Партызану Айчыннай вайны» яна адзначана адным з першых загадаў Цэнтральнага штаба партызанскага руху ў сакавіку 1943 года — такі быў падарунак да Жаночага дня сарака найлепшым жанчынам-партызанкам Беларусі.

А вось ордэн Айчыннай вайны І ступені адважная патрыётка атрымала толькі ў 1949 годзе пасля выхаду доўгачаканага Указа Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 30 снежня 1948 года. Пра гэта ўдалося зусім нядаўна даведацца са знойдзенага ў архіве дакумента. Справа ў тым, што Куляшова, як і тысячы беларускіх партызан пасля вайны, шукала абяцаныя ім узнагароды. Тры гады яна звярталася ў БШПР, ЦК КП(б)Б, Магілёўскі абкам партыі, імкнучыся высветліць пытанне аб сваім узнагароджанні. Не атрымаўшы жаданага адказу, Куляшова звярнулася з лістом да Сталіна. Як і варта было чакаць, гэты ліст з Масквы пераадрасавалі ў ЦК КП(б)Б. 26 лістапада 1946 года загадчык групы па вядзенні спраў БШПР паведамляў на яе адрас у Магілёве: «Вы прадстаўлены да ордэна Айчыннай вайны І ступені і ўключаны ў праект Указа Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР. Рашэнне аб узнагароджанні партызан яшчэ не прынята».

Як склалася пасляваенная жыццё гераічнай жанчыны-партызанкі? На гэтае пытанне спадзяёмся атрымаць адказ ад сваякоў і людзей, якія ведалі Людмілу Мікалаеўну Куляшову-Гразнову.




**Генадзь БАРКУН, гісторык.**

Ігуменскі тракт
№ 5 (270)

# «Я ПА СВЕЦЕ ХАДЖУ ДЫ ЧУЖЫЯ КУТЫ ЎКРАШАЮ...»

## Як маляваныя дываны захоўваюць беларускі эпас

**У чым адметнасць маляваных дываноў? Навошта нашыя продкі захоўвалі іх у сваіх хатах? Ці актуальны гэты старажытны від мастацтва цяпер? Карэспандэнту «Звязды» падчас персанальнай экскурсіі па Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры адказалі на ўсе гэтыя пытанні. І не толькі адказалі, але і паказалі.**

Маляваныя дываны адносяць да жанру народнай творчасці, які актыўна развіваўся ў Беларусі. З-за невялікіх фінансавых магчымасцяў селяніна менавіта такія дываны былі выбраны ім як недарагі спосаб упрыгожыць жытло. Гэтай з'явай у пачатку XX стагоддзя зацікавіўся легендарны мастак-вандроўнік Язэп Драздовіч. Ён убачыў хараство народнага маляванага дыванка і, каб захаваць майстэрства, пачаў таксама працаваць у гэтым кірунку. Сусветную вядомасць атрымала творчасць народнай мастачкі Алены Кіш — яна не мела мастацкай адукацыі, хадзіла па вёсках, малюючы часам проста за ежу і дах над галавой. Маляванне дываноў было для яе магчымасцю і зарабіць на жыццё, і выявіць сябе. Не адразу ў грамадстве была ўсвядомлена каштоўнасць гэтых выдатных узораў інсітнага мастацтва, спатрэбіліся намаганні прафесіяналаў-энтузіястаў, якія ратавалі ад знішчэння старыя маляваныя дыванкі, што ўладальнікі адпраўлялі на гарышча, у хлеў, замяняючы на купленыя ў краме. Трэба было яшчэ растлумачыць прыгажосць, незвычайную каштоўнасць гэтых шэдэўраў. Але час расставіў акцэнкі, жанр не толькі дайшоў да нашых дзён, але і атрымаў папулярнасць сярод шырокага кола людзей. Так што паслядоўнікі Язэпа Драздовіча і Алены Кіш жывуць сёння сярод нас, асабліва шмат іх на Віцебшчыне. Нездарма пункт «Традыцыйнае мастацтва маляваных дываноў Віцебскага Паазер'я» ў 2016 годзе ўключаны ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Рэспублікі Беларусь.


Фота Яна ХВЕДЧЫНА.

На выстаўцы «Чароўных слоў увасабленне». Легенды, паданні і казкі Віцебшчыны ў беларускіх маляваных дыванах», якая адкрылася ў Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры, прадстаўлена 38 работ з 14 раёнаў Віцебшчыны. На іх адлюстраваны і лепельскі цмок, і ганчарнае рамяство з Дуброўна, і непасрэдная даніна павагі Віцебску — Марк Шагал. Дываны маюць абавязковую кампазіцыйную структуру: арнаментальная або кветкавая рамка, асноўны малюнак, размешчаны ў цэнтры і, канешне ж, чорная тканіна ў якасці фону. Тэхніка выканання аднолькавая, а вось аўтарскі почырк, каларыт і стылістыка розныя.

Здавалася б, чаму ў літаратурным музее выстаўляюць маляваныя работы? Гэта звязана з тым, што народная творчасць дываноў непарыўна звязана з эпасам. Кожная работа выканана на аснове легенд, паданняў і казак. Найбольш часта на дыванах сустракаюцца русалкі, жар-птушкі, цмокі і нячысцікі. Таксама ў аснову сюжэтаў некаторых узораў ляглі творы класікаў беларускай літаратуры: Янкі Маўра, Уладзіміра Караткевіча і Максіма Багдановіча.

У экспазіцыю ўключаны як работы народных майстроў, так і мастакоў акадэмічнай школы. У наведвальнікаў ёсць магчымасць стаць удзельнікам музейнай акцыі «Падарунак Віцебску» і паспрабаваць сябе ў стварэнні маляванага дывана: аўтар і куратар экспазіцыі «Чароўных слоў увасабленне» Ірына Князева дапаможа зрабіць першыя крокі ў засваенні адмысловай «дыванковай» тэхнікі і намаляваць на падрыхтаваным палатне невялікі сюжэт або фрагмент. Агульнымі мастацкімі намаганнямі створыцца адзін сяброўскі дыван, які будзе вандраваць з асноўнай экспазіцыяй па іншых музеях. Плануецца, што выстаўку пакажуць як у рэгіёнах Беларусі, так і за мяжой.

Экспазіцыя «Чароўных слоў увасабленне» была арганізавана разам з Віцебскім абласным метадычным цэнтрам народнай творчасці. Убачыць дываны, а таксама паглыбіцца ў свет народнага мастацтва, стаўшы на пэўны час майстрам, можна будзе да 20 красавіка ў Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры па вуліцы М. Багдановіча, 13.

**Арына КАРПОВІЧ.**

# ТАЯМНІЦЫ АРХІВА

## Мастак Яўген Кулік

**Калі мы з мужам наведваем Кальварыйскія могілкі, якія непадалёк ад нашага дома, заўсёды праходзім звыклым маршрутам, пазначаным для нас магіламі беларускіх дзеячаў. Янка Лучына, Вячаслаў Адамчык, Ніл Гілевіч, Іван Навуменка, Алесь Пісьмянкоў, Алесь Асташонак ды іншыя... Цэлы беларускі культурніцкі некропаль... Абавязкова спыняемся і каля помніка, на якім белымі літарамі на чорным граніце напісана «Яўген Кулік» і даты жыцця: «31 кастрычніка 1937 — 12 студзеня 2002».**

Легендарны мастак, беларускі патрыёт, ён помніцца ўсім. Хваравіты, прыгорблены, сціплы, ён проста гарэў тым агнём, які быў ува ўсіх славутых адраджэнцаў, абаронцаў нацыянальнай культуры. У 1960-я ў яго майстэрні ўтварыўся сапраўдны дысідэнцкі салон, які назвалі «На паддашку». А яшчэ кажуць, што ён быў адным з заснавальнікаў нацыянальна-рамантычнай плыні беларускага пасляваеннага мастацтва... Успомніць яго афармленне «Песні пра зубра» Міколы Гусоўскага ці серыю «Замкі Беларусі» — сапраўдныя шэдэўры.

У маладосці, кажуць, быў высокі, пад два метры... Але з-за рэдкай хваробы суставаў згорбіўся, косці зрабіліся крохкія. Неяк пад канец жыцця, паслізнуўшыся і ўпаўшы, атрымаў дванаццаць пераломаў...

Але працаваў да апошняга. І паспеў шмат — палаючы такім агнём... І не толькі ў колькасці намаляванага. Мяркуйце самі: ён быў старшынёй Камісіі па народным мастацтве і рабоце з народнымі майстрамі пры Саюзе мастакоў БССР, займаўся збіраннем і экспанаваннем творчай спадчыны Алены Кіш, Язэпа Драздовіча, Апалінара Пупко, уваходзіў у гісторыка-мемарыяльную камісію Саюза мастакоў БССР, у моўную камісію Беларускага фонду культуры і Рэспубліканскі савет Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры, і гэта яшчэ не ўсё.


З замалёвак Яўгена Куліка падчас падарожжа па Беларусі.

І вось нядаўна на сайце Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва з'явілася навіна: завяршылася навуковая апрацоўка архіва Яўгена Куліка. Неверагодна багатага, у якім не адно пакаленне даследчыкаў зробіць адкрыцці. Дакументы паступілі ў БДАМЛіМ ад сястры мастака, Тамары Сяргееўны Мінкевіч і яго сяброў. Як пазначана на сайце, «у выніку навуковага апісання быў складзены вопіс № 1, які складаецца з 12 раздзелаў, усяго сфарміравана 1434 справы (11049 дак.) за [1784]-2019 гг.».


Усе вы ведаеце, што Мінску ўжо больш за 900 гадоў. Горад развіваўся ... У XI ст. ... Свіслачы і Немігі, у канцы XI стагоддзя — драўляны замак з мураванымі храмамі, ... рынкам, далей але да канца XV стагоддзя — горад з замкам умацаваны земляным валам і равамі са шматлікімі праваслаўнымі культавымі збудаваннямі і значнай драўлянай забудовай

Вялізнае багацце! Чаго вартая адна «Фотатэка па гісторыі Беларусі і іншых краін», у якой звесткі па археалогіі, нумізматыцы, архітэктуры, гісторыі... Агромністая калекцыя рукапісаў, кніг і перыядычных выданняў за 1903—1998 гг., калекцыя гістарычных, этнаграфічных і картаграфічных дакументаў, самы ранні датаваны 1887-м...

Дакументы знаходзяцца ў адкрытым доступе, таму давайце разам з вамі трохі зазірнём у гэты ўнікальны фонд.

### Хлопчык з Паўночнага завулка

«44-ты год, і немцы пакідаюць Мінск, а Саветы яшчэ не прыйшлі. Я памятаю гэта, таму што я быў удзельнікам гэтага. І квартал гарыць... І пабеглі мы, і схаваліся мы рэштках ацалелыні сямейства на Замчышчы гістарычным, у акопах, у траншэях. Абарончыя траншэі былі пракапаны прама на беразе Свіслачы, гэта яшчэ раней яны былі, я не ведаю, ад каго. І там хаваліся жыхары вынішчаных кварталаў Мінска.

І, значыцца, мы колькі дзён чакалі прыходу Саветаў у гэтых траншэях. І есці не было нічога, таму што маці ўхапіла з дому толькі слоік патакі і хлеб. І яшчэ што было — свечкі, але і есці было немагчыма. І чакалі гэтыя тры дні. І вось калі самалёт, відаць, савецкі, на нізкай адлегласці ад зямлі так уносіўся над намі, а мужыкі нейкую бляху недзеададралі і накрывалі гэтыя траншэі, каб засцерагчыся, магчыма, ад асколкаў ці ад куль. Вось так.

А потым сустракалі Саветы, гэта ўжо другая гісторыя».

Гэта ўрывак з убачаных мною ў архіве ўспамінаў Яўгена Куліка, як пазначана на папцы з некалькімі старонкамі тэксту — «Расшыфроўка магнітафоннага запісу гутаркі Я. С. Куліка з Г. Г. Сокалавым-Кубаем (10 жніўня 1997 г.), зробленая Т. С. Мінкевіч». (Сокалаў-Кубай — вядомы мастацтвазнавец, сябар Куліка, які не раз бываў «На паддашку».)

Чытаем жа ўспаміны далей... Атмасферна, нечакана, з захаваннем асаблівасцяў маўлення апавядальніка:

«Пасляваеннае ліхалецце было багатае на розныя крымінальныя здарэнні, у горадзе арудавалі розныя банды, у тым ліку і славутая «Чорная кошка». Разносіліся розныя страшныя чуткі з гэтай нагоды. У нас, небагатых, не было чаго рабаваць, але і мы, асабліва дзеці, пачувалі сябе па начах няказвата. Але рэчаіснасць апярэджвала пагалоскі. Жахлівыя чуткі разносіліся па Мінску пасля таго, як 3 студзеня 1946 года на карнавале з нагоды Новага года ў клубе НКУС на плошчы Волі (цяпер называюць домам Шменкеля) па недаглядзе, а хутчэй за ўсё, з дыверсіі, жыўцом згарэлі ці параразбіваліся некалькі сотняў маладых хлопцаў і дзяўчат. Звесткі пра гэта яшчэ доўга скаланалі горад».

А што мяне асабліва зачапіла ў гэтых успамінах — дык мы з мастаком, хоць разбегліся ў часе, былі суседзямі! Ён жыў у Паўночным завулку, гэта непадалёк ад новай станцыі метро «Плошча Францішка Багушэвіча». Мы часта ходзім па тым завулку, дзе засталіся ўзоры драўлянай архітэктуры векавой даўніны — на жаль, назіраем, як іх становіцца ўсё менш, а тыя, што захаваліся, занепадаюць ці перабудоўваюцца... І гэта вельмі хвалюе — даведацца, што там было ў 1946—1948 гадах. Напрыклад, мясцовыя дзеці ўзімку любілі на таратайцы — гэта выгнуты адпаведным чынам жалезны прут, на які станавілася па некалькі чалавек, — з'язджаць па крутым схіле ад сярэдзіны Паўночнага завулка да вуліцы Карла Лібкнехта. Сапраўды, і сёння там можна заўважыць схіл, хоць не такі круты, але ўсё забудавана так, што па ім не пакатаешся...

Ці вось яшчэ дэталь: «Старэйшыя пацаны з нашага наваколля займаліся і такім промыслам. На вуліцы Карла Лібкнехта каля чыгуначнага пераезда месцілася гароднінная база. Як толькі машына, нагружаная гарбу-

# МАЙСТРА З «ПАДДАШКА»

## ратаваў Верхні горад і высмейваў шаблоны

замі, капустай ці іншай буйной агароднінай, выязджала з яе, хлопцы з прутамі з загнутымі вострымі канцамі кідаліся да яе і начаплівалі на пруты ўсё, што траплялася, і зніклі са здабычай».

Можна яскрава ўявіць, як па раёне, яшчэ не забудаваным «хрушчоўкамі», бегае малы Яўген, маючы з сабою лусту чорнага хлеба з тонкім слоем павідла, выдадзеную маці — увесь наедак на паўдня. «1947 год. Нялёгкае жыццё, карткі на хлеб». Бацька працаваў ахоўнікам на мясакамбінаце, маці ўладкавалася на абутковую фабрыку імя Кагановіча. Да буйных палітычных свят выдавалася на душу па тры кіло мукі. «Вельмі запомнілася гэтая сталінская мука... Чэргі займалі напярэдадні, дзяжурылі ўсю ноч, складаліся спісы, нумары пісаліся хімічным алоўкам на руках». А назаўтра — цісканіна, у якой перамагалі найбольш дужыя. Малы Яўген быў адпраўлены ў такую краму, якая знаходзілася ў падвальным памяшканні — часам людзі ў чарзе так душыліся, што былі смяротныя выпадкі. Як прайсці да прылаўка, дзе па спісах чарга іх сям'і? «Падшыванца па галовах перадалі з навалачкай у руках».

З успамінаў даведалася, што «ў самым нізе Паўночнага завулка», у «старасвецкай сядзібе з высокімі вокнамі, завешанымі даўгімі светлымі гардзінамі», жыла сям'я са шляхецкім прозвішчам Нартыш-Брук — малы Яўген сябраваў са сваім равеснікам Колькам з гэтай сям'і... Магчыма, і сёння апісаны дом застаўся, прынамсі, ёсць падобны — але ўжо з праселым дахам, забітымі дошкамі вокнамі...

Апісвае Яўген Кулік і «Вугал» — месца, дзе вяліся купля-продаж, на скрыжаванні вуліц Мяснікова і Калектарнай. Там старэйшая сястра Яўгена Галя перапрадавала цукеркі-падушачкі, якія выраблялі гарадскія ўмельцы. А да чыгункі Яўген з Галяй хадзілі «ў трэскі» — збіраць драўляныя ашчэпкі, кавалкі драўніны, каб было чым прапаліць печку.

Дарэчы, знайшла цікавыя звесткі пра тое, што ў раннім маленстве з будучым мастаком адбыўся выпадак,


Яўген Кулік. Аўтапартрэт.

які пазней палічылі прарочым. Маці з немаўляткам на руках пераходзіла праз Нямігу — яшчэ да таго, як славутую раку замуравалі ў трубах пад зямлёй. Яе выток быў жа непадалёк ад нас, у пачатку сучаснага праспекта Дзяржынскага. Была галалёдзіца, маці паслізнулася ды ўпусціла дзіця ў раку. Рака, на шчасце, зусім неглыбокая, абышлося... Але сямейныя лічылі, што такі хрост у гістарычнай вадзе паўплываў на лёс Яўгена, прадвызначыў цікавасць да старасветчыны.

## Ратаванне Плошчы Свабоды

А вось яшчэ адна цікавая папка, у якой — аўтограф выступлення Яўгена Куліка ў 1975 годзе ў оперным тэатры, на абмеркаванні праектаў па будаўніцтве... тэатра імя Янкі Купалы.


Яўген Кулік. Ілюстрацыя да рамана Уладзіміра Караткевіча.

Вы, дарэчы, ведалі, што ў 1975-м усур'ёз абмяркоўвалі ўзвядзенне на тэрыторыі Плошчы Свабоды «здания универсального зала многоцелевого назначения на 4 тысячи мест», дзе і меркавалася размясціць тэатр?

«На нашу думку, месца для будаўніцтва тэатра выбрана абсалютна адвольна і бяздумна. Прыняцце рэкамендацый праграмы конкурсу выкліча знішчэнне апошніх рэштак гістарычнага цэнтра Мінска, якія захаваліся пасля папярэдніх паспешлівых і неабгрунтаваных рэканструкцый і пераробак», — абураецца Яўген Кулік. Некалькі наступных старонак даклада перакрэслены алоўкам — відаць, гэта той тэкст, які аказаўся залішні для агучвання з прычыны часу, там падрабязна апісваецца, як, у якім годзе «ў ахвяру рублю былі прынесены гісторыя і архітэктурная спадчына», тобок хроніка разбурэння старога Мінска.

Далей у дакладзе Яўген Кулік пералічвае, якія помнікі архітэктуры ці іх рэшткі насамрэч знаходзяцца на тэрыторыі, што прапануецца пад новую забудову, і падлягаюць знішчэнню. Гэта і былыя муры мужчынскага базыльянскага кляштара першай паловы XVII ст., будынкі былога жаночага базыльянскага кляштара, год узвядзення — 1650, Дом масонаў, дом Ваньковіча, гандлёвыя рады і гэтак далей, усяго дзевяць пунктаў. Уявіце толькі, што згаданыя помнікі архітэктуры, якімі мы сёння любуемся ў адноўленым Старым горадзе, маглі не існаваць! Каб не рупліўцы, накшталт Яўгена Куліка.

Разглядае мастак у сваім выступленні і прадстаўленыя на конкурс праекты, асноўны закід — «Ні адзін з прадстаўленых праектаў нават у малой ступені не адлюстроўвае нацыянальную архітэктурную традыцыю». Заўважае мастакоўскім вострым вокам і плагіятчыну:

«Скажам, у праекце пад дэвізам «Вянок» верхняя частка будынка рашаецца пад яўным уздзеяннем новага опернага тэатра ў Вільні», «Яўна ўсходні каларыт мае праект «Красный квадрат с диагональю», «Зусім сярэднеазіяцкі выгляд мае будынак на праекце «000222». Плаўная крывізна далёкаўсходніх пагад натхняла, нам здаецца, аўтараў конкурснага праекта пад дэвізам «Тэатр і горад». «У мадэрным стылі заходняга ўзору выкананы праект «Матылёк» — нагрувашчванне цыліндрычных, авальных, вінтападобных формаў». «Пляцоўку касмадрома нагадвае будынак у праекце «Васьміграннік», альбо найноўшы аэравакзал — праект «Салют». Эксперт выказваецца дастаткова з'едліва: «Прабачце, але хвалёны «Залаты квадрат» хутчэй нагадвае падземны гараж, а не будынак нацыянальнага тэатра». «Дзівосная мешаніна прамавугольных і цыліндрычных аб'ёмаў з формамі мадэрна канца XIX ст. «а ля рюс» суіснуе ў праекце «Черный треугольник».

Асабліва абурае Яўгена Куліка, што многія аўтары бязлітасна перапланіроўваюць раён, нават тыя ўчасткі Старога горада, якія не маюць дачынення да праекта тэатра, пры гэтым і там гістарычная забудова падлягае зносу. Толькі адзін праект пад дэвізам «Теоктит» Кулік ухваліў за тое, што аўтары імкнуліся цалкам захаваць існуючую забудову, пераносячы новы будынак на вуліцу Інтэрнацыянальную, а каб гарманізаваць праект з асяроддзем, адмыслова ўжывалі матывы мінскай архітэктуры 30-х гадоў.

Але выснова ўсё ж адна: ніводны з прадстаўленых праектаў цалкам не адпавядае важнай задачы стаць памяшканнем для нацыянальнага тэатра, і месца для будаўніцтва непадыходзячае.

Дарэчы, ёсць у архіве яшчэ адзін цікавы рукапіс, адкуль тое-сёе працытавана ў дакладзе — «Хроніка тэрору архітэктараў». Там Яўген Кулік па гадах, пачынаючы з




1930-40-х, пералічвае факты зносу гістарычных будынкаў Мінска. Цэркваў, касцёлаў, сінагог, могілак, маёнткаў, жылых дамоў... Напрыклад, у пункце 1949 г. значыцца:

«- знос будынка б. дамініканскага кляштара і касцёла (пачатак XVII ст.),

- перабудова будынка б. кафедральнага касцёла (1712 г.)

- знос будынка з комплексу езуіцкага кляштара (присутственное место) з вежай (XVIII ст.).»

Нездарма Кулік аб'ехаў усю Беларусь, замалёўваючы архітэктурныя помнікі, робячы візуальную рэканструкцыю зруйнаваных, у чым яго ўсяляк падтрымліваў Уладзімір Караткевіч. У 1978 годзе, дарэчы, мастак стварыў адну з найлепшых сваіх работ — станковую ілюстрацыю да новага рамана Караткевіча «Хрыстос прызямліўся ў Гародні», у якой адлюстраваў панараму старажытнага Гродна.

На шчасце, у выпадку з конкурсам на праект тэатра грандыёзнае будаўніцтва, якое знішчыла б вядомую нам Плошчу Свабоды, так і не адбылося.

## «Памятка плагіатору»

Як вы ўжо ўпэўніліся, Яўген Кулік не цярпеў фальшы, халтуры, умеў падмячаць запазычанні — і меў смеласць выказвацца... Аднойчы яго за гэта нават выключылі з Акадэміі мастацтваў... Здарылася такое, калі рэктарам акадэміі быў Аскар Марыкс, славуты тэатральны мастак славацкага паходжання, чалавек сталы, заслужаны, можна сказаць, легендарны. Адзін са студэнтаў (не Кулік, наколькі мне вядома) схаваўся ў шафу падчас рэктарскага прагляду студэнцкіх работ, потым пераказаў таварышам, што гаварылі выкладчыкі, абмяркоўваючы іх плён. Ясная справа, што паміж сабой выкладчыкі дазваляюць сабе агучыць рэзкія ацэнкі... Студэнты абурыліся, а Яўген Кулік тады назваў выкладчыцкае абмеркаванне «судзілішчам». Вось і пацярпеў... Яшчэ раз сітуацыя паўтарылася, калі Яўген дазволіў сабе востры жарт у прысутнасці аднаго прафесара. Але абодва разы таленавітаму студэнту далі магчымасць працягнуць навучанне.

Тое, што не ўсякую крытыку, асабліва суб'ектыўна-эмацыянальную, варта выказваць публічна, з цягам часу разумеюць усе. Але занатаваць яе хаця б для сябе хочацца. У фондзе Яўгена Куліка ёсць унікальная рэч — макет сатырычнага альбома «Памятка плагіатору» (як варыянт, аўтар разглядаў назву «Памятка плагиатора»). У асобных папках — матэрыялы да гэтага альбома. Як вялікі знаўца сусветнага мастацтва, і класічнага, і сучаснага, Яўген Кулік мог адразу пазнаць на карцінах калег, сучасных яму беларускіх мастакоў, запазычанні... Вось гэтаму ён і прысвяціў свой альбом. Пабудаваны той так: фатаграфуецца карціна ці фрагмента карціны вядомага мэтра, а побач, у тым жа памеры, даецца фота падобнага фрагмента ці карціны з прасторы сусветнага мастацтва. Так што любы скептык адразу бачыць падабенства кампазіцыі, паставу рук ці аблічча персанажа. Старонкі альбома аздабляюцца выказваннямі з Біблії пра крадзяжы, афарызмамі пра плагіят. «Правда всплывёт на поверхность, но теперь она для этого должна глубоко нырнуть. Станислав Ежи Лец», «Кто работает на совесть, а кто и на других казачков. Эмиль Кроткий». «Все, что вы написали, пишете, и еще только хотите написать — уже давно написала Ольга Шапир, печатавшаяся в Киевской синодальной типографии. Ильф. Записные книжки». На вокладцы альбома — Мона Ліза ў хустцы Алёнкі...

Глядзіцца альбом з незвычайнай цікавасцю... Характэрна, што зазвычай двайнікі лягчэй знаходзяцца ў карцін на афіцыёзныя тэмы — там больш месца шаблонам. Ахоп для параўнання ў Куліка наздзвычай шырокі. Напрыклад, да адной класічнай беларускай карціны Кулік знаходзіць двайніка ў мексіканскага мастака Ароска, да другой — у румынскага мастака Перахіма.

Зразумела, чаму альбом не быў надрукаваны. Я сама засумнявалася, як расцэньваць гэткі артэфакт... Дырэктар архіва-музея літаратуры і мастацтва Ганна Запартыка, у якой я спыталася пра лёс «Памяткі плагиатора», мяркуе, што гэта было для ўнутранага карыстання аўтара, ён працаваў над альбомам, так бы мовіць, каб «спусціць пару». Вядомая мастацтвазнаўца Надзея Вусава распавяла мне, што запазычанні ў мастацтве, падобныя згаданым у альбоме, сустракаюцца паўсюдна. Цяжка пазбегнуць, каб, скажам, становішча рук персанажа на тваёй карціне ніколі за стагоддзі існавання выяўленчага мастацтва ні на якой іншай карціне ўжо не было адлюстравана. Часта мастакі адмыслова робяць цытаты, інтэрпрэтацыі. З іншага боку, шаблоны — бяда «афіцыйнага» мастацтва, а ў Яўгена Куліка было асаблівае непрыняцце гэтай з'явы. Сатырычны альбом «Памятка плагиатора» можна расцэньваць як жарт, ад якога яго «ахвяры» не робяцца менш таленавітымі. Тым не менш унікальны артэфакт існуе і зрабіўся ўжо часткай гісторыі.

Пісьменніца Галіна Багданава ў эсэ пра Яўгена Куліка піша: «Наш Кулік не кожны. Наш Яўген Кулік быў мастаком і сваё балота не столькі хваліў, колькі парадкаваў, шукаючы на ім трывалыя купіны, па якіх можна ісці наперад. Гэтымі купінамі для яго заставаліся наноў адкрытыя, разгорнутыя для ўсіх старонкі гісторыі і ягоны ўласны архіў, дзе былі сабраныя самыя цікавыя публікацыі з газет і часопісаў».

Мы з вамі закранулі толькі асобныя фрагменты з архіва Яўгена Куліка. Незлічоныя багацці гэтых сховаў яшчэ чакаюць сваіх даследчыкаў і ўдзячных карыстальнікаў.

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона (оператор ЭТП)** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5, корп. 2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **ООО «Гард Плюс», г. Минск, ул. Кирова, д. 18, пом. 60,61,62, 6-й этаж, литер А 12/бл – производство по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) № 600-18Б/2020 в экономическом суде г. Минска** |
| **Антикризисный управляющий** | **ООО «Капитал Диалог», г. Минск, ул. Тростенецкая, 5-215, +375291308530** |
| **Адрес ЭТП** | **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов**

**Лот № 1 (одним лотом)**
**Адрес – Брестская обл., Малоритский р-н, северо-западнее д. Закрутин**

| Наименование (назначение) | Об. пл. кв. м | Инвентарный номер |
|---|---|---|
| **Баня** (здание специализированное для бытового обслуживания населения) | 73,5 | 103/С-187 |
| Составные части и принадлежности: кабельные линии, покрытие, сети тепловые | | |
| **Гараж** (здание специализированное автомобильного транспорта) | 395 | 103/С-194 |
| Составные части и принадлежности: кабельные линии, покрытие, сети тепловые | | |
| **Заправочная станция** (здание специализированное иного назначения) | 18,4 | 103/С-185 |
| Составные части и принадлежности: кабельные линии | | |
| **Казарма** (здание жилое специального назначения) | 447,4 | 103/С-190 |
| Составные части и принадлежности: кабельные линии, сети канализации, сети тепловые | | |
| **Конюшня** (здание специализированное животноводства) | 95,3 | 103/С-166 |
| **Котельная** (здание специализированное энергетики) | 183,5 | 103/С-165 |
| Составные части и принадлежности: кабельные линии, тепловые сети, резервуар для хранения мазута Р-100 (2 шт.), резервуар для хранения мазута Р-25 (8 шт.) | | |
| **Контрольно-пропускной пункт** (здание специализир. иного назначения) | 14 | 103/С-189 |
| Составные части и принадлежности: наруж. освещение, каб. линии, забор, наруж. освещение, забор | | |
| **Ледник** (здание специализированное иного назначения) | 67,7 | 103/С-177 |
| **Пожарное депо** (здание специализированное иного назначения) | 325,3 | 103/С-157 |
| Составные части и принадлежности: холод. пристройка, каб. линии, теп. сети, 3 пож. водоема, резервуар для воды | | |
| **Раздаточная** (здание специализированное иного назначения) | 94 | 103/С-155 |
| **Сварочный цех** (здание специализированное иного назначения) | 13,9 | 103/С-161 |
| Составные части и принадлежности: кабельные линии | | |
